

БРЭСТ СТАНЕ «РАЗУМНЫМ» ГОРАДАМ

МС

ЧАМУ Ў ХОЙНІКАХ НЕ БАЯЦЦА РАДЫЯЦЫІ?

МС




Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

11 КАСТРЫЧНІКА 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 194 (29061)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім ЕРМАЛОВІЧ, міністр фінансаў:**

*«Мы плануем падчас штогадовага пасяджэння саветаў кіраўнікоў МВФ і Сусветнага банка абмеркаваць вынікі рэалізацыі мер урада па стабілізацыі макраэканамічнай сітуацыі і магчымасці для пачатку праграмы з МВФ менавіта ў мэтах падтрымкі структурных змен. Мінфін лічыць, што дарожная карта павышэння эфектыўнасці эканомікі Беларусі, якая рыхтуецца ўрадам і Сусветным банкам, можа быць падтрымана рэсурсамі з боку МВФ. Такая падтрымка можа быць як у рамках новай праграмы, так і асобна ад яе. З пункту гледжання напаўнення дарожнай карты, гэты дакумент рэальны да выканання».*

# МАЙСТРЫ ЗА СПРАВАЙ



Фота БелТА.

**Ну, канешне, яшчэ не зусім майстры, а навучэнцы клуба дэкаратыўнай творчасці «Барэльеф», што дзейнічае ў Свяцілавіцкім сельскім доме рамёстваў Бяльніцкага раёна. Акрамя Данііла КУЖЭЛЬНІКАВА і Сяргея ЦВЫРА, якіх вы бачыце на фота, у клубе займаюцца яшчэ 13 хлопчыкаў і дзяўчынак. Пад кіраўніцтвам Алега Кавалёва яны вучацца ствараць вырабы з гіпсу, алебастру, іншых хуткасохнучых матэрыялаў. Мяркуючы па ўсім, дзецям гэты занятак даспадобы.**

## КОРАТКА

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне па пытаннях удасканалення інфраструктуры Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы».





• **Нобелеўская прэмія па літаратуры за 2018 і 2019 гады прысуджана польскай пісьменніцы Вользе Такарчук і аўстрыйскаму пісьменніку Петэра Хандке.**

• Мінскі стадыён «Дынама» ўвайшоў у топ-15 самых ёмістых футбольных арэн СНД.


ISSN 1990 - 763X


Сацыяльны клопат

## ШТО ПАТРЭБНА ДЛЯ ЎМАЦАВАННЯ СЕМ'ЯЎ?

### Грашовая падтрымка, асвета і мужчынскае здароўе, сцвярджаюць спецыялісты

**Сёння ў нашай краіне шмат чаго робіцца для ўмацавання інстытута сям'і і сямейных каштоўнасцяў, прычым на гэта скіравана работа ўсіх органаў дзяржкіравання і многіх грамадскіх арганізацый, паведаміў намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Валерый КАВАЛЬКОЎ.**

**НА ШТО ПАТРАЦІЦЬ СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ?**

З 2015 года дзейнічае так званы «сямейны капітал», калі пры нараджэнні трэцяга і наступнага малога сям'я мае права на аднаразовую выплату. На 1 кастрычніка бягучага года больш за 74 тысячы сем'яў ужо адкрылі дэпазітныя рахункі, на якія залічаны 741 мільён долараў ЗША. Дзеючая праграма заканчваецца 31 снежня 2019 года, але Прэзідэнтам краіны ўжо прынята рашэнне аб далейшым выдзяленні сямейнага капіталу на 2020—2024 гады. Толькі калі раней сем'ям, каб скарыстацца грашыма, трэба было дачакацца, калі дзіця, у сувязі з нараджэннем якога прызначаны сямейны капітал, дасягне 18 гадоў, то ў новай праграме такія абмежаванні знятыя. Сродкі можна выкарыстаць датэрмінова і накіраваць іх на будаўніцтва, рэканструкцыю і набыццё жылля, на некаторыя віды медыцынскіх паслуг і на атрыманне платнай адукацыі. Прычым за гэтыя грошы могуць вучыцца і старэйшыя дзеці, а не толькі тыя, пад каго сям'я атрымала такую фінансавую дапамогу ад дзяржавы.


СТАР. 4


Прэм'ера рубрыкі




На двары — кастрычнік, а ў нас на стале штодзень зяляніна з уласнай градкі.

*Мы з мужам больш як 10 гадоў пражылі ў Мінску. Увесь гэты час соўгаліся з рэчамі па здымных кватэрах. Сваркі і гучная музыка за сценкай, недакуркі ў пад'ездзе, байкеры, што гойсаюць пад вокнамі ўначы, капітальны рамонт, які расцягнуўся амаль на год... Усё гэта, ну і, вядома, мая цяжкарнасць (не хацелася гадаваць дзіця ў такіх умовах) натхнілі нас на думку пераехаць жыць у вёску. І вось сёлета, на чарговую гадавіну вяселля, мы зрабілі сабе падарунак — перавезлі рэчы ў Малую Вусу, што на Узздзеншчыне. Гэтае месца асаблівае, з гісторыяй. Па-першае, у суседняй Вялікай Вусе нарадзіўся Пятро Глебка. У гонар паэта там названая цэнтральная вуліца. Па-другое, абедзве вёскі ў вайну былі спаленыя немцамі, а іх жыхары сагнаныя ў Германію. Тут і сёння жывуць асаблівыя людзі, пра якіх я буду пісаць у сваіх нататках. А таксама дзяліцца навінамі з вясковай хаткі ды думкамі, якіх на свежым паветры штодзень з'яўляецца процьма — толькі паспявай запісваць.*


СТАР. 4

Выбары-2019

## Патэнцыйны Савет Рэспублікі: большасць мужчын і «навічкоў»

**Кандыдатам у дэпутаты прыбавілі эфірнага часу, а назіральнікі на выбарах сенатараў упершыню атрымалі афіцыйны статус.**

Цэнтральная камісія Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў на чарговым пасяджэнні зарэгістравала кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання. Па інфармацыі **старшыні ЦВК Лідзіі ЯРМОШЫНАЙ**, усе асобы вылучаны ва ўстаноўлены тэрмін (да 8 кастрычніка), вылучэнне па ўсіх рэгіёнах адбылося законна, абгрунтавана, легітымна. Сярод зарэгістраваных кандыдатаў — прадстаўнікі розных галін ад медыцыны і ваеннай службы да педагогікі і юрыспрудэнцыі.

У Савеце Рэспублікі Лідзія Ярмошына прагназуе дастаткова прыкметнае абнаўленне. А ў ніжнюю палату сёлета паўторна вылучаецца больш прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат, чым у 2016 годзе, — звыш трэцяй часткі патэнцыйных дэпутатаў, што, на думку старшыні ЦВК, забяспечыць неабходную пераемнасць, дасць неабходны досвед новаму скліканню.

ЦВК падвядзе вынікі выбараў у верхнюю палату беларускага парламента і зарэгіструе членаў Савета Рэспублікі 12 лістапада.

У гэту выбарчую кампанію Цэнтрвыбаркам упершыню атрымаў запыт з нагоды накіравання і акрэдытацыі назіральнікаў пры правядзенні выбараў членаў Савета Рэспублікі. Падчас ускосных выбараў у большасці краін увогуле не прадугледжана назіранне. Беларускі выбарчы кодэкс ускладае вызначэнне парадку назірання на ЦВК.

На пасяджэнні прынята адпаведная пастанова, згодна з якой за выбарамі сенатараў могуць назіраць члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў дзейнага склікання, выбраныя ад адпаведнай вобласці ці акругі, а таксама дэпутаты адпаведных абласных Саветаў, якія самі не з'яўляюцца кандыдатамі. Фактычна так было і на папярэдніх выбарах, але назіральнікі не мелі афіцыйнага статусу.

### Эфір — у прайм-тайм

Па краіне ў кандыдаты ў дэпутаты вылучаны 703 чалавекі, з іх 176 — па Мінску. Паколькі ў сталіцы назіраецца вялікі рост колькасці патэнцыйных кандыдатаў у параўнанні з 2016 годам, ЦВК мусіла прасіць у тэлебачання дадатковага эфірнага часу. Вырашана даваць магчымасць для выступленняў па будных днях, акрамя аўторка, не гадзіну, а гадзіну і сорак хвілін. Графік размеркавання эфірнага часу апублікаваны на сайце ЦВК. У выпадку памяншэння колькасці кандыдатаў у вызвалены час пачнецца правядзенне дэбатаў.

Як і раней, атрымаць бюлетэнь для галасавання на выбарах у ніжнюю палату парламента можна на падставе пашпарта грамадзяніна Беларусі. З улікам розных жыццёвых сітуацый выбаршчыкаў ЦВК дазваляе карыстацца таксама пасведчаннем кіроўцы, пенсійным пасведчаннем, ваенным ці студэнцкім білетам, пасведчаннем інваліда, пасведчаннем супрацоўніка дзяржаўнай арганізацыі — дакументамі, у якіх ёсць фота. Але гэтае правіла актуальнае выключна для галасавання грамадзян, якія загадзя ўключаныя ў спіс на адпаведным участку.

Грамадзяне, якія знаходзяцца ва ўстановах крымінальна-выканаўчай сістэмы, маюць права прагаласаваць па месцы адбывання пакарання і толькі 17 лістапада, без магчымасці аддаць свой голас датэрмінова.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

## ЧАМУ ЛЮДЗІ СТАНОВЯЦЦА ЗАЛОЖНІКАМІ ЗЯМЕЛЬНЫХ АДНОСІН?

### Мясцовыя ўлады павінны прадухіляць такія сітуацыі

**Асабісты прыём грамадзян правёў у Крупках першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ. Па дапамогу да яго прыйшлі жыхары горада і раёна. Са сваімі праблемамі прыехалі таксама грамадзяне з іншых райцэнтраў Мінскай вобласці, сталіцы, Гомельскай, Магілёўскай, Віцебскай, Брэсцкай абласцей. Пытанні ў людзей былі самыя розныя — зямельных узаемаадносін, капітальнага рамонту жылфонду, работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, уладкавання ачышчальных збудаванняў, працаўладкавання.**



Фота БелТА.

У прыватнасці, Таццяна Уладзіміраўна з Навалукомля, што на Віцебшчыне, трыццаць чатыры гады адпрацавала на чашніцкім участку электрасувязі Аршанскага занальнага вузла электрасувязі. Ёй 55 гадоў, усяго два гады заставалася да пенсіі. Але з жанчынай датэрмінова перарвалі кантракт, нібыта за прагулы. Таццяна Уладзіміраўна вусна адпрасілася з работы, каб забраць дачку з радзільнага дома, яе падмяніў муж, які працуе на гэтым жа прадпрыемстве, прычым ён атрымаў на гэта згоду кіраўніцтва. Нягледзячы на гэта, жанчыне далі вымову і звольнілі з работы, маўляў, усё трэба было афарміць дакументальна. Ёй, інжынеру, прапаноўвалі работу балетмайстра. Іронія, ды і годзе... Да гэтага часу Таццяна Уладзіміраўна беспрацоўная.

Максім Рыжанкоў пагадзіўся, што ў перадпенсійным узросце чалавеку сапраўды цяжка знайсці работу. І перш чым звальняць, жанчыне павінны былі падрыхтаваць іншае месца. Але мясцовыя ўлады нічога ўзамен не прапанавалі, практычна выкінулі заяўніцу на вуліцу. Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі нагадаў, што мясцовым уладам трэба больш уважліва ставіцца да такіх людзей. Як сказаў Прэзідэнт, задача ўлады — бачыць такіх людзей, дапамагаць у працаўладкаванні, гэтым павінны займацца спецыяльныя камісіі разам з кіраўнікамі прадпрыемстваў, арганізацый, райвыканкамамі. Максім Рыжанкоў узяў пытанне пад кантроль.

Таіса Пятроўна, Рэгіна Вікенцьеўна і Ніна Іванаўна — пенсіянеркі. Яны пражываюць у Крупках у доме 1971 года пабудовы. У будынку працякае дах, вада трапляе ў падвалы. Праўда, камунальнікі экстранна рэагуюць на сітуацыю — адпампоўваюць ваду. Але гэта не выйсце, неабходны капітальны рамонт будынка. Ды ён штогод пераносіцца. Дырэктар Крупскага раённага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Жылцеплабуд» Дзмітрый Ліпскі пацвердзіў, што дом сапраўды мае патрэбу ў капрамонце і што ён запланаваны на 2021 год. Максім Рыжанкоў прапанаваў прааналізаваць спецыялістам пытанне яшчэ раз і, калі ёсць магчымасць, паскорыць тэрміны рамонту. Старшыня Крупскага райвыканкама Анатоль Козел паабяцаў яшчэ раз вярнуцца да гэтага пытання і выказаў гатоўнасць прыняць меры, каб хутчэй адрамантаваць дом.

Іна Ігараўна цікавілася, калі будзе ўведзена ў эксплуатацыю цэнтральная каналізацыя ў Крупках. Рэч у тым, што камунікацыі праходзяць па яе зямельным участку і захопліваюць яшчэ некалькі. На агародзе гаспадары не могуць нічога пасадзіць, бо нечыстоты з калодзежаў прасочваюцца ў зямлю. Пытанне не вырашаецца на працягу некалькіх гадоў. Намеснік старшыні райвыканкама Анатоль Ганчар сказаў, што новую каналізацыю пачалі будаваць у 2010 годзе. Па плане работы павінны былі праводзіцца ў тры этапы. Але не хапае сродкаў, каб іх завяршыць. Тым не менш кіраўніцтва раёна гэтую праблему бачыць і абяцала да канца года тэму закрыць.

Ну і, вядома, не абышлося без зямельных спрэчак паміж суседзямі. «Такіх пытанняў на кожным прыёме бывае па тры-чатыры. І гэта нездаровая тэндэнцыя. Шмат сітуацый узнікае з прычын не зусім правільных, вывераных, пацверджаных заканадаўствам рашэнняў мясцовых улад, сельсаветаў. Самае цікавае, што яны пры гэтым хаваюцца ў цень, маўляў, даўно было. А што рабіць суседзям, калі яны сталі заложнікамі непростых адносін, якія атручваюць ім жыццё? У гэта ўцягваюцца іншыя суседзі, а праблему стварыла мясцовая ўлада. Дык знайдзіце сёння ў сабе мужнасць, магчымасць і вырашыце гэтыя праблемы зыходзячы з таго, што вы дапамаглі стварыць іх самі», — падкрэсліў напрыканцы прыёму Максім Рыжанкоў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Парламенцкі дзённік

## ТАРЫФ «БЮДЖЭТНЫ»

### Сістэма налічэння заробкаў бюджэтнікаў стане больш зразумелай

**На гэта накіраваны законапраект «Аб змяненні законаў» (па пытаннях аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый). Гэты дакумент быў учора разгледжаны дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў на пасяджэнні сёмай сесіі.**

З 1 студзеня 2020 года згодна з Указам № 27 заробак будзе фарміравацца з акладу, стымулюючых і кампенсуючых даплат. Большыя магчымасці для рэгулявання аплаты атрымаюць кіраўнікі арганізацый. Дэпутаты да пачатку дзеяння змен прыводзяць заканадаўства ў адпаведнасць з Указам.

**Член Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Анатоль ДАШКО** адзначыў, што дзеючая сістэма ставак вельмі складаная: «Сістэма спросціцца, там скасуецца каля 300 пастаноў Мінпрацы».

Новая тарыфная сістэма для бюджэтнікаў уключае базавую стаўку і 18-разрадную тарыфную сетку замест 27-разраднай.

Пры гэтым кожнае бюджэтнае ведамства распрацавала свой парадак стымулюючых і кампенсуючых даплат. Цэнтралізаванай застанецца толькі базавая стаўка — 180 рублёў, але, як запэўніў парламентарый, яна будзе імкнуцца да бюджэту пражытачнага мінімуму (сёння амаль 231 рубель).

Таксама праект закона прадугледжвае залік перыяду альтэрнатыўнай службы ў стаж работы ў бюджэтных арганізацыях.

**Міністр фінансаў Максім ЕРМАЛОВІЧ**, які прысутнічаў на пасяджэнні, у размове з журналістамі паведаміў пэўную інфармацыю аб бюджэце на будучы год. Так, дэфіцыт можа скласці амаль 1 мільярд рублёў. Страты ад падатковага манеўра Расіі ў рэспубліканскім бюджэце 2020-га дасягнуць 400 мільёнаў долараў ЗША. Такая ж сума недаатрымана сёлета.

Больш аптымістычныя прагнозы на бюджэт у дэпутатаў. Па словах **члена Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Таццяны САЙГАНАВАЙ**, плануецца пашырэнне яго расходнай часткі з-за сацыяльнай накіраванасці: «У прыватнасці, будуць павялічаны заробкі ў бюджэтнай сферы. Але мы бачым, што пункты росту даходаў ужо ёсць — гэта работа прамысловага сектара эканомікі, работа малога і сярэдняга бізнесу, чаму, несумненна, будзе спрыяць прынясце новай рэдакцыі Падатковага кодэкса».

Бюджэт пакуль не паступіў у парламент, але чакаецца на працягу некалькіх дзён.

У першым чытанні разгледзелі ў Авальнай зале і законапраект «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства». Прапанавана выключыць замежнікаў, якія здзейснілі злачынства па неасцярожнасці, з катэгорыі асоб, якім могуць адмовіць у выдачы віз ці ўездзе ў Беларусь. Важным дапаўненнем стане дазвол на ўезд для замежнікаў, якія прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу ў Беларусі і не пагасілі яго праз тое, што не мелі адпаведнай інфармацыі. Па словах **Івана ПАДГУРСКАГА, першага намесніка міністра ўнутраных спраў**, на сёння ў спіс асоб, уезд якіх у краіну забаронены ці непажаданы, уключана больш за 1 мільён 140 тысяч чалавек. Большасць з іх унесена Расіяй. Абнаўленні закона будуць спрыяць павышэнню турыстычнай і інвестыцыйнай прывабнасці нашай краіны.

Таксама дэпутаты ратыфікавалі Пратакол аб унясенні змяненняў у пагадненне паміж урадамі Беларусі і Расіі па супрацоўніцтве ў галіне экспарту нафты і нафтапрадуктаў. «Па-першае, ён дасць дакладнае разуменне, у якіх аб'ёмах мы будзем пастаўляць, напрыклад, сырую нафту, — расказаў пра нававядзенні **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Аляксей СОКАЛ**. — Падругое, па некаторых нафтапрадуктах (бензін, дызельнае паліва, мазут) калі на год складзены патрэбы нашага ўнутранага рынку, то гэта дае стабільнасць. І самае галоўнае, гэта дае поўную загрузку нашых нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў».

**Марыя ДАДАЛКА.**

## ЗАДАЦЬ ПЫТАННЕ І АТРЫМАЦЬ КАМПЕТЭНТНЫ АДКАЗ

**Мінгарвыканкам і аблвыканкамы ў гэтую суботу, 12 кастрычніка, правядуць традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі.**

**З 9.00 да 12.00 на званкі грамадзян адкажуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221 31 21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

старшыня ГОМЕЛЬСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Кацярына Анатольеўна ЗЕНКЕВІЧ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Руслан Віктаравіч ПАРХАМОВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарвыканкама Анатоль Аляксандравіч СІВАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

## БЕЛАРУСЬ У 2020 ГОДЗЕ СТАНЕ СУСТАРШЫНЁЙ У СНД

**А ў 2021-м узначаліць гэту арганізацыю, аб чым паведаміў старшыня Выканаўчага камітэта — выканаўчы сакратар СНД Сяргей Лебедзеў. Гэтымі днямі ў Ашгабаце (Туркменістан) праходзіць Савет кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**

Учора падчас Савета міністраў замежных спраў Садружнасці **кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства Уладзімір МАКЕЙ** выказаў пазіцыю нашай краіны ў сферы рэгіянальнай бяспекі.

Ён адзначыў, што прыярытэтнай тэмай сёння з'яўляецца забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі краін СНД.

«Вы бачыце, якія прэтэнзіі вылучаюцца ў дачыненні адно аднаго шэрагам дзяржаў, — перадае словы Уладзіміра Макея БелТА. — Мы з'яўляемся сведкамі хакерскіх нападаў супраць не толькі пэўных устаноў, але і цэлых краін. Таму гэтая тэма будзе абмяркоўвацца і на пасяджэнні СМЗС, і на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў. І Беларусі ёсць пра што праінфармаваць калег. У нас прынята адпаведная канцэпцыя інфармацыйнай бяспекі, існуе шэраг ініцыятыў, накіраваных на ўдасканаленне гэтай дзейнасці».

Напярэдадні падзеі

# ЗОРКІ ЗАПАЛЬВАЮЦЦА ТУТ!

**Міжнародны турнір па мастацкай гімнастыцы на прызы алімпійскай чэмпіёнкі Марыны Лобач пройдзе ў Мінску 19—20 кастрычніка ў Палацы мастацкай гімнастыкі.**

З 2002 года гэты турнір стаў традыцыйным, за 17 гадоў спаборніцтвы заслужылі славу адных з самых яркіх і значных мерапрыемстваў па мастацкай гімнастыцы ў міжнародным календары. Беларусь штогод прымае больш за дзясятак краін-удзельніц, геаграфія якіх пастаянна пашыраецца. З'яўляючыся своеасаблівым стартам для юных грацый, турнір адкрыў вялікаму спорту такія імёны, як Валерыя Курыльская, Настасся Іванькова, Ганна Рабцава, Аляксандра Наркевіч, Меліта Станюта.



Юныя спартсменкі ад 9 да 15 гадоў у узроставых катэгорыях будуць весці барацьбу за каштоўныя прызы, галоўныя з якіх — іменныя статуэткі Марыны Лобач, — па традыцыі дастаюцца перамožцам у мнагабор'і. Замежныя гімнасткі настойліва імкнуцца скласці годную канкурэнцыю гаспадыням спаборніцтваў. Беларускім грацыям з кожным годам усё цяжэй утрымліваць вышэйшыя прыступкі п'едэстала. Але нашы дзяўчаты з уласцівым ім бляскам выходзяць пераможцамі ў нялёгкай турнірнай барацьбе. Ужо шмат гадоў ні адна статуэтка алімпійскай чэмпіёнкі не пакінула межаў нашай радзімы і ні адна спартсменка не засталася без падарунка ад арганізатараў.

***Расклад турніру:***

<u>**19 кастрычніка**</u>

11.00 — цырымонія адкрыцця;

11.30 — прэюніёркі 2007 — 2008 г. н. (каманднае першынство);

14.00 — юніёркі 2004 — 2006 г. н. (каманднае першынство);

16.30 — прэюніёркі 2007 — 2008 г. н. (мнагабор'е);

17.30 — юніёркі 2004 — 2006 г. н. (мнагабор'е);

<u>**20 кастрычніка**</u>

11.00 — прэюніёркі 2007 — 2008 г. н. (фіналы);

12.30 — юніёркі 2004 — 2006 г. н. (фіналы);

14.30 — цырымоніі ўзнагароджання і закрыцця;

15.30 — гала-канцэрт.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# У ВАЛЕЙБОЛЕ БУДУЦЬ ЗМЕНЫ?

**Галоўныя трэнеры мужчынскай і жаночай зборных падалі ў адстаўку**

**На трэнерскім савеце кіраўнікамі федэрацыі валейбола гэтыя адстаўкі былі прынятыя. Нагадаем, мужчынская зборная пад кіраўніцтвам Віктара Бекшы не змагла выйсці з групы на чэмпіянаце Еўропы, жаночая каманда, якую трэніраваў Пётр Хілько, таксама не пераадолела гэтую мяжу.**

**Генеральны сакратар федэрацыі Ала ЦЯЦЕРЫНА** падзякавала Віктару Бекшу за работу ў зборнай і дасягнуты вынік: «Мы ведаем, што гэта адзін з найлепшых трэнераў нашай краіны. Ён папрасіў паўзу, таму што быць трэнерам і зборнай, і клубнай каманды вельмі цяжка. Гэта каласальная фізічная і псіхалагічная нагрузка. Таму мы разумеем і падтрымліваем такое рашэнне, але не развітваемся з Віктарам Іванавічам. Мы спадзяёмся, што праз некалькі гадоў зноў убачым яго на пазіцыі галоўнага трэнера зборнай».

Цяпер федэрацыя абмяркоўвае кандыдатаў на гэтую пасаду.

Асноўным прэтэндэнтам з'яўляецца брытанскі трэнер Джэйсан Холдэйн. Як адзначае **старшыня федэрацыі Эдуард ВЕНСКІ:** «Магчыма, замежны спецыяліст прыўнясе ў нашу зборную штосьці новае і свежае». Дарэчы, у якасці гульца Холдэйн удзельнічаў у Алімпіядзе-2012, абараняў колеры цэлага шэрагу еўрапейскіх клубаў. Выйграваў Лігу чэмпіёнаў (2001), Кубак ЕКВ (1999) і Суперкубак Еўропы. У якасці трэнера працаваў у азербайджанскім «Азерйоле» (2014—2015) і ўваходзіў у трэнерскі штаб зборнай Канады (2017).

Асноўным кандыдатам на пасаду галоўнага трэнера жаночай нацыянальнай каманды па валейболе разглядаецца галоўны трэнер «Дынама-Метар» Дзяніс Мацвееў. У федэрацыі валейбола адзначаюць, што 40-гадовы беларускі спецыяліст валодае добрым гульнявым і трэнерскім досведам.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Аты-баты

# НА ВАРТУ ЗАСТУПІЦЬ «УРАГАН»?

**Гэтымі днямі на палігоне пад Асіповічамі была паспяхова выпрабаваная мадэрнізаваная рэактыўная сістэма залпавага агню «Ураган». Яна прайшла праз глыбокую мадэрнізацыю на прадпрыемствах Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта.**

Істотныя дапрацоўкі датычыліся тактыка-тэхнічных характарыстык. У сістэмы з'явілася новае шасі, на яго ўсталяваныя сучасныя сродкі навігацыі, сувязі, перадачы даных, пазіцыянавання...

**Начальнік ракетных войскаў і артылерыі Узброеных Сіл — начальнік упраўлення ракетных войскаў і артылерыі Генеральнага штаба Узброеных Сіл генерал-маёр Генадзь КАЗЛОЎСКІ** адзначыў:

— Усе пускі прайшлі паспяхова, і снарады трапілі ў цэль з высокай дакладнасцю. Але гэта былі толькі папярэднія выпрабаванні. Яшчэ некаторыя элементы трэба дапрацаваць. У хуткім часе «Ураган» чакаюць дзяржаўныя выпрабаванні. Пасля гэтага будзе вырашацца пытанне аб пастаўцы гэтых баявых машын у нашы Узброеныя Сілы.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Італьянскі парламент чакае скарачэнне



Колькасць заканадаўцаў павінна зменшыцца прыблізна на трацін: з 630 да 400 дэпутатаў і з 315 да 200 сенатараў, перадае Euronews. Ніжняя палата прыняла гэтую ініцыятыву пераважнай большасцю галасоў. Супраць канстытуцыйнай рэформы выступілі толькі 14 дэпутатаў. Прыхільнікі гэтых пераменаў гавораць як пра эканомію бюджэтных сродкаў, так і пра абарону інтарэсаў выбаршчыкаў. Яны ўпэўненыя, што дэпутаты павінны прадстаўляць інтарэсы большай колькасці грамадзян і шырэй глядзець на іх праблемы. Праціўнікі ініцыятывы абвінавачваюць улады ў перавароце і разбурэнні канстытуцыйнага балансу. Змены павінны ўступіць у сілу пасля будучых парламенцкіх выбараў у 2023-м, калі яны не будуць абмеркаваны на рэферэндуме.

## У Інданезіі здзейснены замах на міністра бяспекі

Міністр-каардынатар па пытаннях палітыкі, юстыцыі і бяспекі Інданезіі Віранта атрымаў нажавое раненне ў выніку нападу ў правінцыі Бантэм. Пра гэта паведамляе партал навін Detik. Паводле яго інфармацыі, 72-гадовы міністр прыбыў у горад Пандэгланг з інспекцыйнай паездкай. Замах быў здзейснены ў момант, калі Віранта выходзіў з аўтамабіля. Зламыснік нанёс яму два ўдары вострым прадметам у вобласць жывата. Акрамя таго, раненні атрымаў кіраўнік мясцовага кіравання паліцыі. Супрацоўнікі службы бяспекі і паліцэйскія затрымалі нападніка, пазней была арыштаваная яго жонка, якую таксама падазраюць у падрыхтоўцы замаху.

## Сатурн выйшаў у рэкардсмены па колькасці спадарожнікаў

Юпітэр саступіў Сатурну першынство па колькасці вядомых спадарожнікаў у Сонечнай сістэме. Раней лічылася, што ў Юпітэра 79 спадарожнікаў, а ў Сатурна — 62. Днямі стала вядома, што астраномы пад кіраўніцтвам Скота Шэпарда з амерыканскага Інстытута Карнэгі выявілі яшчэ 20 спадарожнікаў Сатурна. Такім чынам, іх агульная колькасць павялічылася да 82, і гэты газавы гігант стаў рэкардсменам па колькасці вядомых спадарожнікаў. Адкрыццё было зроблена з дапамогай тэлескопа «Субару» з дыяметрам люстэрка 8,2 метра. Ён знаходзіцца на вяршыні вулкана Мауна-Кеа на Гаваях. Ва ўсіх адкрытых нябесных цел дыяметр складае каля пяці кіламетраў. 17 з іх маюць рэтраградны характар руху па арбіце, гэта значыць яны рухаюцца вакол Сатурна ў кірунку, процілеглым кручэнню планеты вакол сваёй восі. Перыяд абарачэння новых спадарожнікаў вакол газавага гіганта — ад двух да больш чым трох гадоў.

# КАЛЯДЫ — ТРЫ ДНІ

У Беларусі зацверджаны графік пераносу рабочых дзён у 2020 годзе




Як паведамілі ў прэс-службе Савета Міністраў, згодна з пастановай № 688 рабочы дзень з чацвярга 2 студзеня пераносіцца на суботу 4 студзеня, з панядзелка 6 студзеня на суботу 11 студзеня, з панядзелка 27 красавіка на суботу 4 красавіка.

Арганізацыям дадзена права з улікам спецыфікі вытворчасці (работы) пераносіць рабочыя дні ў іншым парадку ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Надвор'е

# Амаль бабіна лета

У нядзелю цяпло з Польшчы прынясе нам плюс 15— 20 градусаў, але месцамі абяцаюць моцны парывісты вецер

**Умовы надвор'я ў нашай краіне будзе вызначаць вільготная цёплая паветраная маса, якая наступае з боку Заходняй Еўропы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Вецер заходні, паўднёва-заходні ўмераны. Максімальная тэмпература паветра сёння ўдзень будзе ад плюс 9 да плюс 15 градусаў.**

А вось заўтра, 12 кастрычніка, паўночная палова краіны застанецца пад уплывам сістэмы франтальных раздзелаў, якія насоўваюцца з боку Заходняй Еўропы, а на паўднёвую частку нашай тэрыторыі пачне пашырацца цёплая паветраная маса з паўднёвага захаду Еўропы. Будзе воблачна з праясненнямі. Пераважна на паўночнай палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы.

Вецер паўднёва-заходні, уначы па паўночным захадзе, удзень на большай частцы тэрыторыі моцны парывісты. Мінімальная тэмпература паветра ўначы ад плюс 6 да плюс 11 градусаў, максімальная ўдзень 11—18 цяпла, а па паўднёвым захадзе — да плюс 20 градусаў. У нядзелю ў нас амаль паўсюдна чакаецца цёплае і сонечнае надвор'е. У гэты дзень наша краіна будзе знаходзіцца пад уплывам цёплых няўстойлівых паветраных мас, якія перамяшчаюцца з тэрыторыі Польшчы. Надвор'е чакаецца воблачнае з праясненнямі, толькі месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёва-заходні ўмераны, уначы ў асобных раёнах моцны парывісты. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе ўжо ад плюс 8 да плюс 12 градусаў, удзень — 12—18 цяпла, на поўдні краіны да плюс 20 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня ўзмоцніцца ўплыў антыцыклону з Заходняй Еўропы. Будзе пераважна без ападкаў і пераважна бяснеўскую цёпла, толькі ў цёмны час сутак месцамі па поўначы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 6 да плюс 12 градусаў, удзень — 15—22 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

22 октября 2019 года в 14.00 в актовом зале общества состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Вишневка – 2010» с повесткой дня:
1. О продаже недвижимого имущества ОАО «Вишневка – 2010».
2. О доизбрании членов Наблюдательного совета ОАО «Вишневка – 2010».
Регистрация участников общего собрания акционеров будет осуществляться 22 октября 2019 года с 13.00 до 13.45 по месту проведения собрания.
Для регистрации необходимо иметь при себе: акционеру – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.
С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по месту нахождения общества (Минский район, аг. Вишневка, ул. Центральная, д.1А) с 08.00 до 17.00 с 11 по 21 октября 2019 года.
*УНП 600041880*

# ШТО ПАТРЭБНА ДЛЯ ЎМАЦАВАННЯ СЕМ'ЯЎ?

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

Малыя першых двух гадоў жыцця ў малазабяспечаных сем'ях атрымліваюць бясплатнае харчаванне. За шэсць месяцаў бягучага года бясплатнымі прадуктамі было забяспечана амаль 15 тысяч дзяцей, пры гэтым больш за чатыры тысячы хлопчыкаў і дзяўчынак атрымалі гэту падтрымку незалежна ад узроўню даходу сям'і (апошняя лічба сведчыць пра тое, колькі ў Беларусі нарадзілася дзетак у двойнях і тройнях).

Бацькі, якія гадуюць дзіцяінваліда, могуць скарыстацца паслугай сацыяльнай перадышкі — на 28 дзён у каляндарным годзе размясціць малога ў доме-інтэрнаце для дзяцей і за гэты час вырашыць уласныя сацыяльна-бытавыя праблемы. Выплата дапамог і пенсій на ўвесь перыяд знаходжання дзіцяці ў інтэрнаце захоўваецца. У першым паўгоддзі ўжо 38 сем'яў узялі такую перадышку.

### МЕДЫЯЦЫЯ І БАЦЬКОЎСКІЯ ЎНІВЕРСІТЭТЫ

У сістэме органаў па працы і сацыяльнай абароне функцыянуе 146 тэрытарыяльных цэнтраў, работа якіх выбудоўваецца з улікам інтарэсаў сям'і і дзяцей. Найперш у цэнтрах ствараюцца банкі даных па розных сем'ях. Збіраецца інфармацыя пра ўмовы пражывання, занятасць бацькоў, адсочваюцца трывожныя фактары, якія могуць сведчыць пра сацыяльную небяспеку ці пра тое, што сям'я мае асаблівыя патрэбы. Да 1 студзеня 2020 года пастаўлена задача стварыць базу даных па шматдзетных сем'ях.

Цэнтры ўлічваюць разнастайныя патрэбы: бацькі могуць атрымаць кансультацыйна-прававую і сацыяльна-псіхалагічную дапамогу. Калі трэба, спецыялісты падказваюць сужэнцам, як разабрацца з канфліктамі, кансультацыі праводзяць юрысты і псіхолагі. Сярод запатрабаваных сёння паслуг — работа нянькі. Распрацаваныя і спецыяльныя праграмы, мэта якіх — павышэнне культуры шлюбна-сямейных адносін. Дзейнічаюць розныя клубы і гурткі. Пры цэнтрах працуюць і «бацькоўскія ўніверсітэты», дзе можна атрымаць інфармацыю па пытаннях выхавання дзяцей і ўмацавання інстытута сям'і. Не застаюцца без увагі і няпоўныя сем'і, і непаўналетнія мамы. Праводзяцца разнастайныя акцыі, лекцыі, святы цэнтрам дапамагаюць грамадскія арганізацыі.

І канешне, у краіне вельмі многа робіцца для таго, каб узнімаць прэстыж сям'і і мацярынства. Жанчыны, якія нарадзілі і годна выхавалі пяцёра і болей дзяцей, узнагароджваюцца ордэнам Маці. Такую ўзнагароду ўжо атрымала больш за 10 тысяч мам, толькі за 2019 год — 567.

### УВАГУ — І МАЛЫМ, І ДАРОСЛЫМ

— Прыярытэтнымі кірункамі як для службы аховы мацярынства і дзяцінства, так і ў цэлым для сістэмы аховы здароўя з'яўляюцца захаванне і ўмацаванне рэпрадуктыўнага здароўя, павышэнне рэпрадуктыўнага патэнцыялу, зніжэнне смяротнасці ў працаздольным узросце, — заўважыла **начальнік аддзела медыцынскай дапамогі маці і дзецям Міністэрства аховы здароўя Людміла ЛЁГКАЯ.**

Каб здзейсніць такія планы, папаўняецца матэрыяльна-тэхнічная база, рыхтуюцца кадры, укараняюцца сучасныя тэхналогіі. 100 працэнтаў жанчын маюць доступ да медабслугоўвання перад родамі і пасля, больш за 97 працэнтаў будучых мам сталі на ўлік па цяжарнасці, што вельмі важна для таго, каб своечасова выявіць адхіленні і прызначыць адпаведныя прафілактычныя і лячэбныя мерапрыемствы. Штогод медыка-генетычнае кансультаванне атрымлівае больш за 30 тысяч пацыентаў. Праводзяцца скрынінг-даследаванні і кансультацыі для цяжарных па праблемах ВІЧ/СНІД.

100 працэнтаў родаў праходзіць пры кваліфікаваным наглядзе, практычна ўсе радзільныя дамы працуюць па сістэме сумеснага знаходжання маці і дзіцяці, прытрымліваюцца прынцыпу груднога выкормлівання.

Трэба сказаць, што з кожным годам радзільні становяцца ўсё больш адкрытыя. У 2018 годзе загадам Міністэрства аховы здароўя быў зацверджаны рэглямент наведвання радзільных дамоў і акушэрскіх аддзяленняў. Завітаць і падтрымаць маладых мам і паглядзець на немаўлят могуць усе члены сям'і.

Удасканальваецца работа службы планавання сям'і. Работа вядзецца з маладым пакаленнем, з жанчынамі і сем'ямі, якія апынуліся ў крызісных сітуацыях. Разам з грамадскімі арганізацыямі медыкі займаюцца прафілактыкай абортаў. З 2014 года ў краіне ўведзена перадабортнае кансультаванне, і сёння яно дае добрыя вынікі. За 2018-ы больш за 20 працэнтаў жанчын, якія звярнуліся ў арганізацыі аховы здароўя па штучнае перапыванне цяжарнасці, прынялі іншае рашэнне, у выніку нарадзілася каля дзвюх тысяч дзяцей. Змаганне за сям'ю працягваецца — у новы праект закона аб ахове здароўя ўжо ўнесены і такія нормы, як псіхалагічнае кансультаванне партнёра і псіхалагічнае кансультаванне сям'і.

На найбліжэйшы час медыкі паставілі задачу палепшыць рэпрадуктыўнае здароўе мужчын, бо цяпер у сем'ях, якія не могуць завесці дзяцей, у 40 працэнтах выпадкаў праблема звязана з моцнай паловай.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## ПРЫСВЕЧАНАЯ МАМАМ

### У Беларусі стартуе арт-эстафета БРСМ

**10 кастрычніка фестывалем «Мамін дзень» у Мінску Саюз моладзі дае старт рэспубліканскай арт-эстафеце «Слова, першае ў жыцці...»**

Мерапрыемствы фестывалю разгорнуцца ў холе ніжняга ўзроўню ГЦ «Сталіца». Тут госці свята змогуць паўдзельнічаць у рабоце хэндмэйд-майстэрняў па вырабе кветак з фаамірану і росписе печыва, паспаборнічаць у конкурсе «спавівання нованароджаных», абсалютна бясплатна атрымаць у падарунак вясёлую і добрую карцінку ад мастакоў-шаржыстаў і нават адправіць віншавальную паштовую картку любімай маме. Дадатковы каларыт у работу святочнай інтэрактыўнай пляцоўкі прыўнясуць майстры аквагрыму. Для самых юных удзельнікаў фэсту валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» падрыхтавалі гульнявую праграму з мноствам актыўнасцяў.

Ганаровыя госці фестывалю — мамы: шматдзетныя, працавітыя, актыўныя, спартыўныя, творчыя. Ім даверана ганаровая місія ўручыць узнагароды маладым талентам падчас урачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў творчага конкурсу БРСМ «Слова, першае ў жыцці...». І менавіта яны стануць гераінямі адкрытага дыялогу «Беларусь і Я», прысвечанага самаму блізкаму і роднаму чалавеку — жанчынемаці, захавальніцы сямейнага ачага.

Арт-эстафета «Слова, першае ў жыцці...» скіравана на ўмацаванне інстытута мацярынства і павышэнне статусу жанчыны-маці ў грамадстве. Мерапрыемствы праекта будуць доўжыцца да 14 кастрычніка: спартыўныя святы, спаборніцтвы маладых мам, майстар-класы і інтэрактыўныя праграмы, творчыя сустрэчы, ушанаванне маці, выстаўкі, пасяджэнні клубаў маладых сем'яў, канцэрты мастацкай самадзейнасці, наведванне радзільных дамоў і іншае.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЯК У БОГА ЗА ПАЗУХАЙ,

## або Суседзі прапасці не дадуць

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

На дварэ кастрычнік — а ў нас на стале штодзень зеляніна з уласнай градкі. Ядзім яе ўволю. Ужо забыліся, як набывалі ў гіпермаркеце дробненькі пучок кропу і ашчадна дзялілі на некалькі разоў. А ўсё дзякуючы вуслянам-агароднікам, якія абярнулі нас у сваю веру. Хоць, шчыра кажучы, мы з мужам супраціўляліся да апошняга. Увесну, калі пераехалі жыць у Малую Вусу, ніводнага насеннечка не закінулі ў глебу. А на пачатку жніўня, як я жартую, курам на смех разбілі ажно дзве градкі. Пасеялі рукалу, кроп, радыс, два віды салаты, марозаўстойлівую цыбульку. А яшчэ і куст базіліку, які, пакуль я стаяла крукам, суседка Галіна Фёдараўна перадала цераз плот.

Суседзі задаволеныя. Бачылі б вы, з якой радасцю яны неслі цяпкі, граблі ды іншыя навароачаныя «дэвайсы» агародніка і насенне ды давалі парады, як найлепей зрабіць. Бабуля Анюта нават сваіх курэй у той дзень не выпускала: чакала, пакуль мой мужык (так тут кажуць) не абгародзіць грады.

Сяброўка, якая летась таксама з сям'ёй пераехала жыць у вёску, на мой аповед пра эксперымент з градкамі адрэагавала катэгарычна. Маўляў, «я не паддаюся на ўгаворванні. І вам не раю. Калі б суседзяў слухала, замест газона бульба расла б. Варта сябе слухаць, свае патрэбы і жаданні».

— Да бульбы, спадзяюся, справа не дойдзе, — супакоіла я сяброўку. — А пад газон ужо ўчастак узаралі, плануем раўняць.

Але сусед Генадзь Сямёнавіч пачуў нас і кажа тут: «Ну вось, малайцы, па вясне бульбачкі пасадзіце пару градак, шмат не трэба», — кажа ён, назіраючы, як я саджу клубніцы для Сымонкі. «Не, мы бульбу не будзем садзіць. Думаю, зелянінай абмяжуемся».

— «Ну-ну, — хітра пасміхаецца сусед. — Трэба запісаць твае словы. Усе так спярша кажуць. Апетыт жа прыходзіць падчас яды».

Дарэчы пра ежу. Улетку жыццё ў Вусе віравала. Вуслянка Тамара вырасціла гіганцкі агурок. Сорт называецца «Мужчынская сіла». На смак так сабе, а вось даўжыня ўражвае — ажно 54 сантыметры І наогул што-што, а агуркі сёлета ў Вусе ўрадзілі на славу.

— Агуркі ў хаце ёсць? — пытаўся Павел, дом якога месціцца на ўскрайку Малой Вусы.


Што-што, а агуркі сёлета ў Вусе ўрадзілі на славу.


Яблычкі-папяроўкі для нашага Сымонкі ад Генадзя Сямёнавіча.

— Ды вось збіралася якраз ехаць на ровары ў Плоскае (суседняя вёска), там кажуць, фермер па рубель семдзесят прадае за кілаграм.

Павел усміхнуўся і моўчкі насыпаў мне з вялізнага тазіка пакет малодзенькіх агурочкаў.

Неўзабаве прыйшла Таццяна, якая жыве праз дом ад нас, і таксама прапанавала агуркоў.


Вярнуліся з сынам з прагулкі, а дома тазік з маладымі агурочкамі, памідорчыкамі ды з малодзенькай цыбулькай «вырас».

— Вазьміце, свежых паясцё, замалосоліце. Я ўжо і сабе, і дочкам накатала.

Калі запыталіся, колькі каштуе, нават абурылася: «Крыўдзіце! Калі не ведалі, дык у нас у Вусе суседзі проста так частуюць, не за грошы, а ад душы».

Праз колькі дзён да нас у двор завітала бабуля Анюта з міскай вымытых агурочкаў.

— Можа, дзе горкі трапіцца, дык вы шкурку абразайце, — клапоціцца.

— Мо, вам кабачкі яшчэ патрэбны, дык ідзіце сарвіце, — паказвае на агарод, што бачны з нашага ўчастка, яе сын Аляксандр, які рэгулярна прыязджае і дапамагае сваёй 84-гадовай маці.

Бабуля Ліда таксама прыйшла, каб прапанаваць агурочкаў.

— У мяне ж адзін зуб застаўся, няма чым есці. А выкідаць шкада.

— Не, не трэба, дзякуй. Нас ужо начаставалі так, што есці не паспяваем!

— Эх, ну пайду яшчэ Міхасю прапаную.

Карацей, з суседзямі нам пашанцавала, жывём як у бога за пазухай. Калі чарговы раз адносіла Галіне Фёдараўне міску з-пад гародніны, нават рыфмаваны радок прыдумала: «У Малой Вусе можна забыць аб галадусе».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**




## ПАЗЫЧАЙ, ЯК ДАВЯДЗЕЦЦА...

Можа, анекдот, а можа, і праўда: сустрэліся неяк два мужыкі. «Не люблю *браць* у доўг, — сказаў адзін, — бо бярэш чужыя і на час, а вось аддаеш свае і назаўсёды». Другі як быццам яму запярэчыў: «А я, — сказаў, — не люблю ў доўг *даваць*: бо даеш як быццам сябрам і на пару дзён, а забіраеш у казлоў і гадáмі».

Нашай сям'і, здаецца, пашчасціла. Ва ўсякім разе, ад такіх вось «сяброў» бог пазбавіў — затое паслаў суседку. Адну, але вартую многіх.

...У нашай кватэры Галя з'явілася на трэці дзень пасля пераезду. Сказала, як яе завуць і з кім жыве, а потым папрасіла грошай — на тыдзеньчык, да зарплаты. Адмовіць ёй неяк не выпадала. Ды і сума была зусім невялікая... Карацей — мы рады былі, што далі суседцы ў доўг — зрабілі добрую справу.

І ў хуткім часе пераканаліся, што ніводная з іх не застаецца беспакаранай, бо Галя з ранейшай просьбай стала прыходзіць ледзь не двойчы на месяц.

Не скажу, разоў колькі грошы яна аддавала, як і абяцала, але ж найчасцей казала, што купіла тое і тое, бо вельмі ж трэба было, скардзілася на жыццё, на мужа, на дарагоўлю, на тое, колькі ідзе на дзіця (а то б, гадуючы сваіх, мы не ведалі), а ўрэшце — ледзь не плакала, што ў хаце ні капейкі — нават на хлеб, і ніхто не можа выручыць, бо ва ўсіх яе знаёмых таксама няма. «Дык можа ў вас...» — дрыжачым голасам пытала суседка.

Сказаць ёй, што няма, азначала б схлусіць, бо заробкі ў нас былі невялікія, але ж і мае, і мужавы бацькі заўсёды жылі па сродках, і нас вучылі планаваць пакупкі, хай пакрысе, але на нешта адкладваць.

Якраз гэтыя грошы (часта апошнія) мы пазычалі суседцы.

Часам, зрэшты, нервы здавалі, і тады я казала Галі, што так нельга, што ў яе амаль дарослая дачка, што трэба ж неяк планаваць свой бюджэт, папярэджвала, што выручаем яе апошні раз...

Галя з усім згаджалася, абяцала, аддавала доўг, а недзе праз месяц як нічога-ніякага «ўлазіла» ў новы. І цягнулася б так, можа, і дагэтуль, але ж вырасла яе дачка, дзеля якой мы пазычалі суседцы грошы, і сабралася замуж.

Бацькі сталі ладзіць вяселле — дома, на 30 гасцей. І перад гэтым Галя пазычала ўжо не толькі грошы, а яшчэ і талеркі, фужэры, салатніцы, міскі, вазы, каструлі... Некалькі дзён дзверы ў нашу і дзве суседнія кватэры не зачыняліся: усё спачатку выносілася, потым заносілася. І гэта б яшчэ нічога — справа жыццёвая, як той казаў: суседзі, вяселле...

Але недзе праз месяц госці ўжо збіраліся ў нас (у мужа быў юбілей). Да яго мы ўсё падрыхтавалі, заставалася накрыць сталы. І тут раптам высветлілася, што... няма чым: з хаты зніклі святочныя абрусы, прычым дарагія-дарагія — даматка્ныя, бабуліны...

Я не адразу, але ж пайшла да Галі: маўляў, можа, у вас засталіся — з вяселля? «У мяне, — вокам не міргнуўшы, сказала суседка. — Я забылася, у каго іх брала, але ж калі гэта і праўда вашы, то зараз аддам. Яны ў шафе ляжаць».

Не ведаю, што ў той момант адбілася ў мяне на твары, аднак Галя таксама пачырванела і папрасіла ў мяне прабачэння. Нават больш за тое (не ведаем, па якім бы дрэве пастукаць?) — перастала прыходзіць па грошы. Думалі: можа, на дваіх ім нарэшце стала хапаць дзвюх зарплат?.. Можа, зяць з дачкой дапамагаюць? А можа, пачулі дзе, што пазычаць можна — як умееш, як давядзецца, а вось аддаваць — хораша.

**А. Засім,**

*г. Барысаў.*

## ПАДАРОЖЖА З САКРЭТАМ

Гэта гісторыя можа камусьці здацца выдумкай, ды я і сам у праўдзівасць яе наўрад ці паверыў бы, калі б не адна істотная акалічнасць: усё, што раскажу, адбылося менавіта са мной.

Тады, гадкоў ...наццаць назад, быў я, калі можна гэтак сказаць, заядлы дамасед: не хацелася нікуды хадзіць ды ездзіць, не падабалася шуміха вялікіх гарадоў, натоўпы чужых, незнаёмых людзей...

Ды тут прычапіўся мой школьны таварыш — стаў клікаць да сябе ў госці ў слынны горад Бабруйск. Я аднекваўся, як толькі мог: спасылаўся на тое, што гэта далёка, што ў такіх паездках я заўсёды знаходжу нейкія прыгоды на сваю галаву, што горад зусім не ведаю і, крый бог, яшчэ заблукаю...

— Нічога, не бойся, — супакойваў мяне былы аднакласнік. — Ты ж на вакзал прыедзеш? Прыедзеш. А там любога чалавека спытай, як дабрацца да таварыша, і табе адразу пакажуць.

— Ды не брашы! — адрэзаў я. — Так быць не можа!

— Можа! — ледзь не пабажыўся хлопец.

— Што — нават адрас казаць не трэба? Нават прозвішча тваё?

— Не.

— Дык скуль жа, — пытаюся, — людзям ведаць, што я да цябе кірую?

— А вось гэта — сакрэт. Прыедзеш — раскажу.

І вось я на вакзале ў Бабруйску. Куды ехаць, вядома ж, не знаю. Падыходжу да дзвюх жанчын, што паблізу гамоняць.

— Прабачце, — кажу ім, павітаўшыся, — я не мясцовы, горад ваш зусім не ведаю, а да таварыша дабрацца трэба...

— Дык гэта ж проста, — усміхаецца адна з маладзіц. — Бачыце — вунь тралейбус стаіць? Сядайце, пакуль не адышоў, і праз тры-чатыры прыпынкі будзеце на месцы.

Я бягом... У апошні момант у салон ускочыў (здзівіцца проста не паспеў, бо трэба ж было прыпынкі лічыць).

Праехаў — і адзін, і два, і тры, яшчэ раз спытаў пра таварыша.

— Дык вам тут выходзіць, — пачуў у адказ.

Ну што ж гэта за жарты такія, думаю: адрас аднакласніка ніхто не пытае, на лбе ў мяне ён не напісаны... У гэтым горадзе што — адны тэлепаты жывуць, чужыя думкі чытаюць?

Спехам, нічога не цямячы, працiскаюся да дзвярэй, на прыпынку выходжу з тралейбуса, азіраюся па баках і разумею, што ніхто з бабруйчан не смяўся — жартаў з мяне не строіў: вось жа, проста перада мной (ад неспадзеўкі аж у вачах пацьмянела) — патрэбны дом на патрэбнай вуліцы, вось і кватэра.

— Ну як ты дабраўся? — з усмешкай спытаў аднакласнік, калі я пазваніў у дзверы.

— Добра! — пахваліўся я. — Але чаму, — ну ніяк не зразумею.

— Ды было б там што разумець, — па-ранейшаму ўсміхаўся гаспадар. — Ідзі сюды — нешта пакажу.

Падводзіць ён мяне да акна, паказвае на другі бок вуліцы. А там — якраз насупраць дома — салідная такая будыніна, на якой вялікімі літарамі напісана: «Кинотеатр «Товарищ».

Так што і сапраўды ўсё было вельмі проста — ніякай парапсіхалогіі, хоць і шкада.

**Анатоль Палынскі,**

*г. Беразіно.*

## «ПАЎЛІТРА ЗА ПАЗУХАЙ», альбо Абяцанка-цацанка

...Без тлумачэння мясцовай лексікі тут не абысціся. Значыць, пастýр — наняты вёскай пастух (звычайна на ўвесь сезон). Шчамлёткі — расшчэплены знізу кій з распоркай для лоўлі жывых гáдзін (слоў «змяя» і «гадзюка» я да школы не чуў).

Такім чынам, некалькі сезонаў кароў у нашай вёсцы пасвіў дзядзька Антось. Яму нешта плацілі грашыма і кармілі — у кожнай хаце па чарзе.

Гэтак жа, па чарзе і з кожнай хаты, у падмогу дзядзьку выдзяляўся памочнік, то-бок падпаскам мог стаць любы, у тым ліку і малы. Я, напрыклад, гэту «прафесію» пачаў асвойваць гадоў з дзевяці, а то і раней. Але ж узрост — нішто. Найцяжэй было прачнуцца да светлага (а палове на пятую), узяць сваю рагулю за повад (накінутую на рогі вяроўку) і амаль кіламетр весці яе, з ночы галодную, да найбліжэйшага ляска, прычым — па вузенькай сцежцы, абапал якой была то сенажаць, то зялёнае жыта...

Карове — ну вядома ж — хацелася нечага скубануць: яна ўвесь час тузала повад, чым будзіла ўжо канчаткова.

Так мы з рагуляй даходзілі да ўзлеску, дзе вяроўку можна было зняць і, што называецца, прыступіць да непасрэднай работы. Пастýр камандаваў: «Гэну адвярні...», «Гэту падгані...», «Тую — пакуль не чапай».

На сённяшні розум я дзіву даюся: як можна было ўдвух, у звычайным лесе, упасвіць тры дзясяткі кароў — не распусціць іх, бо інакш статак проста стравіў бы маладыя пасадкі альбо сенакос, нарабіў шкоды.

Такім чынам, калі коратка, на нішчымным выпасе бедныя былі і вясковыя кароўкі, і самі пастухі.

...У той дзень, апроч статка, у нас з дзядзькам Антосем быў яшчэ адзін клопат: зранку, дастаўшы з торбы, ён паказаў мне вялікую цёмную бутэльку, сказаў, што цётка Гэлька абяцала яму паўлітра гарэлкі за жывую гáдзіну, якую хоча потым заліць першаком і настояць — зрабіць нацiранне на хворую спіну...

А ў лесе ж звычайна так: калі гаворыш пра змяю, то яна абавязкова падпаўзе. І тады ўжо — калі хочаш злавіць — не варонь.

Дзядзька Антось гэта добра ведаў. Ён толькі што зрабіў новыя шчамлёткі. А далей — убачыў гáдзіну, прыціснуў яе да зямлі, спрытна выцягнуў расгорку... Потым досыць доўга яшчэ валэндаўся, пакуль скіраваў, можна сказаць, "загнаў" здабычу ў пустую бутэльку. «Ну вось, паўлітра, лічы, за пазухай!» — затыкаючы коркам пасудзіну, радаваўся дзядзька.

...Пасля гэтай радоўкі з «паляваннем» мы з ім недзе з месяц не сустракаліся — аж пакуль я зноў не трапіў у падпаскі. І тады ўжо, вядома ж, спытаў, ці аддзячыла цётка за лекі?

Пастýр трохі збянтэжыўся і сказаў, што не, на вялікі жаль, — толькі абяцае, але з дня на дзень.

Што мяне здзівіла тады — крыўды ў дзядзькавым голасе не было зусім: была — надзея. І я, помню, падумаў яшчэ, што паўлітра «не сёння дык заўтра» гэта, можа, і... лепш, чым учора ці месяц таму.

**Іван Сіманёнак,**

*г. Паставы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

## Неасабісты суб'ектыў

# Мы хадзілі глядзець фрэскі...



### Як пазбавіцца ад восеньскай нуды

У Спаса-Праабражэнскім саборы Міrожскага манастыра — самым старажытным храме старажытнага Пскова — захаваліся дзівосныя фрэскі XII стагоддзя. Наўгародскі архіепіскап Ніфант, па замове якога сабор пабудавалі ў далёкім 1148 годзе, быў чалавекам, мякка кажучы, не бедным, пра што сведчыць глыбокі сіні колер, які служыць фонам для ўсіх сюжэтаў, выяўленых на сценах храма. Сіняя фарба рабілася ў тыя часы з лазурыту — паўкаштоўнага каменя, які здабываўся на тэрыторыі сучаснага Афганістана. Улічваючы лагістыку і тэхналогіі XII стагоддзя, можна толькі ўяўляць, колькі яна каштавала. Менавіта таму ўсе іконы паўночнаславянскіх земляў (тыя ж пскоўскія) такія змрочна-цёмныя — барвова-карычнева-зялёныя: пісалі мясцовымі, таннейшымі фарбамі. А тут — проста раскоша — заходзіш у нізенькі, за стагоддзі ўрослы ў зямлю больш чым на два метры сабор — і ад захаплення і нечаканасці аж дух займае — нібы яшчэ адно неба навісае проста над галавой...

Такія храмы ахоўвае, напэўна, сам Усявышні. Ворагаў у пагранічнага Пскова заўсёды было хоць адбаўляй, але ж Міrожскі сабор выстаяў. Нават падчас апошняй, самай разбуральнай вайны, калі падчас наступлення савецкіх войскаў немцы занялі абарону ў манастыры і іх выбівалі адтуль і артылерыяй, і авіяцыяй, у сабор трапіў толькі адзін снарад. Прычым дзівосным чынам заляцеў у вузкае акенца храма, ударыўся ў супрацьлеглую сцяну і... не разарваўся, пакінуўшы толькі выбоіну, праз якую цяпер добра відаць старажытная кладка.

З фрэскамі асобная гісторыя. Першы раз іх папсавалі ў XVII стагоддзі, калі сцены замазалі тынкоўкай, пабялілі і павесілі на іх іконы — мода была такая. Тады яшчэ людзі не разумелі, якую каштоўнасць хаваюць пад тынкоўкай. Тое ж, што зрабілі ў канцы XIX стагоддзя, выглядае (дый тады павінна было выглядаць) як акт вандалізму. Фрэскі тады знайшлі выпадкова — пры рамонце храма адваліўся кавалак тынкоўкі. Было вырашана іх адкрыць і давесці да ладу. Бо выявы захаваліся, але патрабавалі рэстаўрацыі — усё-такі больш за трыста гадоў пад іншым слоем. «Рэстаўрацыю» правялі своеасабліва — спяшаліся ўгадзіць царкоўнаму начальству — падмалявалі фрэскі таннімі клеевымі фарбамі. Спачатку ўсё было ярка і прыгожанька, а праз пару гадоў фарбы пацьмянелі, пасля ўвогуле пачарнелі. Паводкі (а храм стаіць паміж рэкамі Міrожа і Вялікая) таксама зрабілі сваю справу, на сценах ёсць адзнакі, дзе вада стаяла ў саборы падчас разліву. Апошні раз зусім нядаўна — у 1960-м, і чалавеку, які стаіць на сучаснай падлозе (метра на паўтара, калі не больш, вышэйшай за падлогу XII стагоддзя), гэта адзнака па пояс.

## УСМІХНЕМСЯ

У рэанімацыю прывозяць параненага з нажом, які тырчыць паміж лапаткамі.
Урач:
— Балюча?
— Толькі калі смяюся.

**Мне здаецца, выкід эндарфінаў пасля заняткаў спортам абгрунтаваны тым, што арганізм проста радуецца, што гэта нарэшце скончылася.**

Яна і ён.
— А скажы мне штонебудзь добрае!
— Ты ў мяне вельмі разумная.
— А яшчэ?
— І з табой мне заўсёды весела!
— Ага. Гэта значыць, усё ж непрыгожая. Зразумела.

**План на рабочы дзень:**
**1. Зрэдку варушыць мышкай, каб камп'ютар не сыходзіў у рэжым чакання.**





caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3519.
Нумар падпісаны ў 19.30 10 кастрычніка 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

11 кастрычніка 2019 г. № 41 (526)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ



## СЁННЯ Ў НУМАРЫ

### Вартавыя мяжы



У інстытуце пагранічнай службы Беларусі навучаюцца хлопцы з Азербайджана, Казахстана і нават Катара. стар. 2

### Што з батарэямі?



З якімі пытаннямі звярталіся на суботнія прамыя лініі да старшыняў Гродзенскага, Мінскага і Віцебскага аблсаветаў дэпутатаў. стар. 3

### Усё агульнае



Як ішла рэалізацыя праекта КАМГОР на Магілёўшчыне? стар. 4, 13

### Symbio City



Канцэпцыя «разумнага горада» ўвасабляецца ў жыццё ў Брэсце. «МС» пацікавілася, што гэта такое. стар. 14

### У пошуках работнікаў



На кірмашы вакансій у Гомелі сярод наймальнікаў асобым попытам карысталіся кухары, санітаркі і будаўнікі. стар. 16


ТЭМА ТЫДНЯ









gorod214.by

# ГОРАД ПАСПЯХОВЫХ ЛЮДЗЕЙ

## Як зрабіць камфортнымі нашы малыя і буйныя населеныя пункты?

**ГАРАДЫ з'яўляліся месцамі прыцягнення людзей у розныя этапы гісторыі. Паводле даных ААН, больш за 50 % насельніцтва планеты, ці каля 4,2 мільярда чалавек, жыве ў гарадах.**

Каб эфектыўна вырашаць гарадскія праблемы, трэба рабіць усё магчымае, каб гарады і населеныя пункты сталі адкрытымі, бяспечнымі і жыццеўстойлівымі, што прадугледжвае Мэта ўстойлівага развіцця № 11.

На дасягненне гэтай мэты накіравана работа праекта «Беларусь: падтрымка зялёнага горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі» («Зялёныя гарады»), які фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў 2016—2021 гадах.

Мэта праекта — больш шырокае развіццё планаў зялёнага горадабудаўніцтва і рэалізацыя пілотных ініцыятыў па зялёным горадабудаўніцтве, звязаных з павышэннем энергаэфектыўнасці і ўстойлівым транспартам у малых і сярэдніх гарадах Беларусі.

У рамках праекта, бюджэт якога складае 3,091 мільёна долараў, рэалізуюцца пілотныя ініцыятывы па ўстойлівым гарадскім транспарце ў Полацку і Наваполацку і мерапрыемствы па павышэнні энергаэфектыўнасці ў Навагрудку. Для гэтых гарадоў былі распрацаваныя планы зялёнага горадабудаўніцтва, а таксама Адзіны план устойлівай гарадской мабільнасці для Полацка і Наваполацка, планы дзеянняў па энергетычным развіцці і клімаце — стратэгічныя дакументы, накіраваныя на зніжэнне выкідаў парніковых газаў.

Каб быць сапраўды эфектыўнымі, ініцыятывы праекта павінны максімальна шырока ўлічваць меркаванне грамадскасці. Таму ў пілотных гарадах у апытанні па праблемах зялёнага развіцця прыняло ўдзел каля 7000 гараджан.

У выніку рэалізацыі пяцігадовага праекта чакаецца прамое скарачэнне выкідаў парніковых газаў на працягу жыццёвага цыкла пілотных ініцыятыў у аб'ёме 91,1 тысячы тон $CO_2$ у эквіваленце.

ВЫБАРЫ-2019

# Хто будзе прадстаўляць інтарэсы выбаршчыкаў?

## Пачалася рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты верхняй і ніжняй палат парламента

**РЭГІСТРАЦЫЯ кандыдатаў у члены Савета Рэспублікі сёмага склікання пройдзе ў Беларусі 9—13 кастрычніка, а рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання правядуць акруговыя выбарчыя камісіі 8—17 кастрычніка.**

Да гэтага часу ва ўсіх абласцях і ў Мінску адбылося вылучэнне прэтэндэнтаў на месцы ў верхняй палаце парламента. Такім правам валодаюць прэзідыумы мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню і адпаведныя выканкамы, а ў сталіцы — прэзідыум Мінгарсавета і Мінгарвыканкам.

Галасаванне па зарэгістраваных ЦВК кандыдатах у сенатары праходзіць на пасяджэннях дэпутатаў мясцовых Саветаў базавага ўзроўню, Мінгарсавета. Абраным лічыцца кандыдат, які набраў больш за палову галасоў.

Нагадаем, што Савет Рэспублікі — палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва. Парадак яе фарміравання спалучае элементы выбарнасці і прызначэння. Па восем членаў абіраюць ад кожнай вобласці і Мінска шляхам тайнага галасавання, яшчэ восем сенатараў прызначае Прэзідэнт. Усяго ў склад верхняй палаты парламента ўваходзіць 64 чалавекі. стар. 2

# Хто будзе прадстаўляць інтарэсы выбаршчыкаў?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Што датычыцца рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, то яна таксама ўжо распачалася. Кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання вылучылася 703 чалавекі. Усяго ў выбарчыя камісіі да гэтага часу паступіла 824 камплекты дакументаў. Такая інфармацыя па стане на 9 кастрычніка размешчана на сайце ЦВК.

Прэтэндэнты на месца ў парламенце часцей за ўсё аддавалі перавагу аднаму з трох спосабаў вылучэння (шляхам збору подпісаў, ад працоўнага калектыву, ад палітычнай партыі) — такіх 82,9 %. Двума спосабамі скарысталіся 16,9 % вылучэнцаў. Адзін чалавек вылучыўся трыма спосабамі.

Палітычныя партыі вылучылі 424 патэнцыйныя кандыдаты ў дэпутаты, або 51,5 % ад іх агульнай колькасці. У лідарах Ліберальна-дэмакратычная партыя (15,2 %), Аб'яднаная грамадзянская партыя (8 %), Камуністычная партыя Беларусі (7,7 %). Шляхам збору подпісаў вылучылася 33 % кандыдатаў у дэпутаты, ад працоўных калектываў — 15,5 %.

Жанчын сярод прэтэндэнтаў на дэпутацкія партфелі 25 %, маладых людзей да 30 гадоў — 8,8 %. Пераабрацца паспрабуюць 34 дэпутаты Палаты прадстаўнікоў дзеючага склікання (4,8 %). Трапіць у парламент паспрабуюць і дэпутаты мясцовых Саветаў, іх 8,3 % ад агульнай колькасці вылучэнцаў.

Што датычыцца прафесійнай дзейнасці вылучэнцаў, то занятых у прамысловасці, будаўніцтве, сферы транспарту сярод іх 16,5 %, прадстаўнікоў навукі, адукацыі, аховы здароўя, культуры і спорту — 15,2 %, дзяржслужачых — 10,1 %.

Дарэчы, перадвыбарная агітацыя на парламенцкіх выбарах у Беларусі стартуе ў сярэдзіне кастрычніка пасля рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты. На наступны дзень пасля яе заканчэння акруговыя выбаркамы правядуць паміж кандыдатамі жараб'ёўку для таго, каб вызначыць дату і час іх выступлення на дзяржаўных радыё і ТБ.

Выступленні кандыдатаў у дэпутаты па радыё і тэлебачанні пройдуць з 21 кастрычніка да 6 лістапада па рабочых днях. Радыёвыступленні будуць з 7.00 да 8.00, тэлевізійныя (яны будуць суправаджацца субцітрамі ці перакладам на мову жэстаў) — з 19.00 да 20.00. Эфірны час кандыдатаў, якія будуць балатавацца па Мінску, выдзеляць «Радыё-Мінск», канал Беларусь 3, па Мінскай вобласці — радыёстанцыя «Мінская хваля», СТБ. Тым, хто будзе вылучацца па іншых абласцях, час вызначаць адпаведныя абласныя тэлерадыёкампаніі.

Для тэледэбатаў эфірны час рэзервуецца з разліку не больш за пяць хвілін аднаму кандыдату. Парадак арганізацыі і правядзення дэбатаў, даты іх правядзення і вядучага вызначаюць тэлерадыёкампаніі.

Сваю перадвыбарчую праграму прэтэндэнты на месцы ў парламенце маюць права апублікаваць альбо ў адной з рэспубліканскіх газет («Звязда», «Рэспубліка»), альбо ў адпаведнай абласной газеце, альбо ў раённых, гарадскіх газетах, якія выдаюцца на тэрыторыі іх акругі. Тэкст кандыдаты павінны прадставіць у СМІ не пазней 27 кастрычніка.

Нагадаем, што выбары ў Палату прадстаўнікоў прызначаныя на 17 лістапада, у Савет Рэспублікі — на 7 лістапада.

**Паводле БелТА.**

# ПАГРАНІЧНІКАМ ВАРТА АКТЫЎНЕЙ ПРАЦАВАЦЬ З НАСЕЛЬНІЦТВАМ

**ТАКУЮ параду выказаў Старшыня Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч падчас наведвання Інстытута пагранічнай службы. Ён азнаёміўся з парадкам падрыхтоўкі курсантаў, сустрэўся з выкладчыкамі і курсантамі ВНУ, адказаў на іх пытанні.**



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Каб лепш быў зразумелы прадмет размовы высокага госця з кіраўніцтвам і супрацоўнікамі інстытута, у двух словах нагадаем кароткую, але цікавую і насычаную гісторыю ўстановы вышэйшай адукацыі органаў пагранічнай службы. Пра прычыны ўзнікнення і этапы станаўлення ВНУ расказаў начальнік інстытута палкоўнік Сяргей Жылінскі. Паводле яго слоў, пасля развалу СССР узнікла патрэба ва ўласнай сістэме падрыхтоўкі афіцэраў менавіта для органаў пагранічнай службы Беларусі. Спачатку гэта быў факультэт пагранічных войскаў. Потым ён увайшоў у Ваенную акадэмію. Затым факультэт стаў Інстытутам пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь. Такі вось шлях. Сёння гэта самастойная і самадастатковая ВНУ з выдатнай матэрыяльна-тэхнічнай базай, сучаснымі аўдыторыямі, у якіх навучаюцца 365 курсантаў. Штогод сюды прымаюць каля сотні чалавек. Лекцыі курсантам чытаюць прафесійна падрыхтаваныя выкладчыкі, сярод якіх тры дактары навук і 23 кандыдаты навук. Яны актыўна ўдзельнічаюць у міжнародных навуковых канферэнцыях. Пераважная большасць выкладчыкаў мае досвед пагранічнай службы.

Міхаілу Мясніковічу паведамілі, што за час існавання інстытута яго выпускнікамі стала больш за дзве тысячы афіцэраў. У іх ліку не толькі маладыя грамадзяне нашай краіны. ВНУ ўжо не першы год ажыццяўляе экспарт навучальных паслуг: у яе сценах сёння можна сустрэць, напрыклад, прадстаўнікоў Кітая. Атрымалі дыпломы афіцэраў-пагранічнікаў грамадзяне Казахстана, Азербайджана, Катара, Узбекістана. Імаверна, што неўзабаве курсантамі інстытута стануць хлопцы з В'етнама і Арменіі. Цяпер ідуць перамовы.

Адукацыйны працэс тут прадугледжвае комплекс тэарэтычных і практычных заняткаў. З парадкам іх арганізацыі і правядзення дэталёва азнаёміўся Міхаіл Мясніковіч. Ён наведаў вучэбныя аўдыторыі і спецыялізаваныя класы, у тым ліку і для вывучэння замежных моў, лабараторыі, вучэбную пагранічную заставу, дзе адпрацоўваюцца навыкі праходжання службы ва ўмовах аховы граніцы.

Старшыня Савета Рэспублікі цікавіўся не толькі выкарыстаннем найноўшых сродкаў тэхнічнага кантролю пагранічнікамі, у прыватнасці электроннага абсталявання, беспілотнай авіяцыі, але і асаблівасцямі псіхалагічнай падрыхтоўкі кадраў, харчаваннем на заставах і тым, як пагранічнікі ўзаемадзейнічаюць з мясцовым насельніцтвам. Бо, па словах Міхаіла Мясніковіча, цяпер рыхтуюцца змены ў Закон аб мясцовым самакіраванні, якія будуць накіраваны на далейшае пашырэнне ініцыятывы жыхароў тэрыторый, і пагранічнікам гэта трэба ўлічваць.

Спікер Савета Рэспублікі таксама прачытаў лекцыю выкладчыкам інстытута на тэму «Актуальныя пытанні развіцця Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе». У ёй Міхаіл Мясніковіч закрануў пытанні ўмацавання экспартнага патэнцыялу краіны, прааналізаваў магчымасці і рызыкі глабальнай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях», спыніўся на праблемах дзейнасці і перспектывах развіцця ЕАЭС, пытаннях дзяржпадтрымкі навукоўцаў, развіцця сістэмы адукацыі і іншых тэмах.

У размове з журналістамі Міхаіл Мясніковіч адзначыў высокі ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў у інстытуце. На яго думку, з гэтай навучальнай установы выходзяць усебакова падрыхтаваныя афіцэры.

**Леанід ТУГАРЫН.**

*Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by*

У ТЭМУ

## Больш за палову прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат у Віцебскай вобласці вылучаны партыямі

**У гэтым рэгіёне па 14 выбарчых акругах падалі дакументы на рэгістрацыю ў якасці кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў 97 чалавек, з якіх амаль 58 % вылучаны палітычнымі партыямі, паведамілі БелТА ў абласной выбарчай камісіі.**

На цяперашнім этапе выбарчай кампаніі ў сярэднім на адзін дэпутацкі мандат ад Віцебскай вобласці прэтэндуе сем чалавек. Гэта вышэй, чым на ўсіх папярэдніх выбарах, прычым канкурэнтнасць павысілася за кошт росту колькасці прэтэндэнтаў, якія жадаюць балатавацца ў парламент па сельскіх акругах. Самая вострая барацьба намячаецца па Аршанскай-Дняпроўскай акрузе № 26, дзе кандыдатамі ў дэпутаты вылучаюцца дзесяць грамадзян.

Амаль 85 % прэтэндэнтаў палічылі за лепшае вылучацца адным з трох магчымых спосабаў. У прыватнасці, здалі подпісы ў падтрымку сваёй кандыдатуры 14 ініцыятыўных груп, палітычныя партыі дэлегуюць у парламент па акругах у Віцебскай вобласці 55 актывістаў. Акрамя таго, 15 прэтэндэнтаў скарысталіся падвойным спосабам вылучэння: ад грамадзян шляхам збору подпісаў і працоўнымі калектывамі (14 чалавек), ад грамадзян і палітычных партый (1).

На дэпутацкія мандаты ад Віцебскай вобласці прэтэндуюць прадстаўнікі васьмі партыйных арганізацый. Ліберальна-дэмакратычная партыя вылучыла 14 актывістаў, Камуністычная партыя Беларусі дэлегуе ў парламент 13 чалавек. Далей па актыўнасці ідуць Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці (вылучыла сем сваіх членаў), Беларуская партыя левых «Справядлівы свет», Аб'яднаная грамадзянская партыя, Партыя БНФ (па 6), Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) (3), Рэспубліканская партыя (1).

У цяперашняй кампаніі актыўна ўдзельнічаюць жанчыны — 19 чалавек, або кожны пяты прэтэндэнт, а таксама дэпутаты мясцовых Саветаў (13). Сярод удзельнікаў выбарчага марафону ўдзельная вага моладзі крыху больш за 4 %. На новы тэрмін маюць намер балатавацца тры дэпутаты Палаты прадстаўнікоў.

Акруговыя камісіі прыступілі да праверкі камплектаў дакументаў і рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, якая павінна завяршыцца да 17 кастрычніка ўключна.

# Кантактаў павінна быць больш

**СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ сустрэўся на мінулым тыдні з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Германіі ў Беларусі Манфрэдам ХУТЭРЭРАМ.**

Як паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента, бакі абмеркавалі пытанні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Беларусь разглядае Германію як ключавога партнёра ў Еўрапейскім саюзе, падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Ён адзначыў станоўчую дынаміку развіцця двухбаковых адносін. Летась тавараабарот паміж краінамі перавысіў тры мільярды долараў. У той жа час сёлета аб'ём узаемнага гандлю скараціўся да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. «Гандаль «прасеў», нам трэба шукаць рэзервы для яго нарошчвання, і яны ёсць», — упэўнены старшыня Савета Рэспублікі.

Перш за ўсё — гэта інвестыцыйнае супрацоўніцтва. Беларусь разлічвае на больш актыўнае партнёрства з кампаніямі Германіі ў сферах, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Міхаіл Мясніковіч нагадаў, што камфортныя ўмовы для інвестараў створаны ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».

«У цэлым у нас мала сумесных кампаній, трэба над гэтым працаваць, у тым ліку з прыцягненнем партнёраў з трэціх краін», — прапанаваў ён. У якасці аднаго з перспектыўных кірункаў узаемадзеяння Старшыня Савета Рэспублікі назваў хімічную прамысловасць. Беларусь вырабляе сучасныя палімерныя матэрыялы (валокны і ніткі) і пастаўляе іх у іншыя краіны. «Мы маглі б рабіць з іх ужо гатовую прадукцыю і зацікаўлены супрацоўнічаць з вамі ў гэтай сферы», — сказаў ён. Сумесныя праекты з Беларуссю адкрываюць для нямецкага бізнесу добрыя магчымасці для выхаду на рынкі краін ЕАЭС, нагадаў Міхаіл Мясніковіч. Ён таксама прапанаваў Германіі развіваць узаемадзеянне ў рамках глабальнай ініцыятывы «Адзін пояс, адзін шлях».

Што датычыцца міжпарламенцкага супрацоўніцтва, то за апошнія гады яно прыкметна актывізавалася, працягнуў Міхаіл Мясніковіч. Выніковым ён назваў сёлетні візіт у Мінск, што адбыўся ў чэрвені, дэлегацыі бундэстага на чале з кіраўніком парламенцкай групы дружбы, членам камітэта бундэстага па эканоміцы і энергетыцы Маркам Хаўптманам. «Мы абмяркоўвалі міжрэгіянальнае супрацоўніцтва. Нам, як Палаце рэгіянальнага прадстаўніцтва, хацелася б, каб было больш кантактаў паміж нашымі краінамі на месцах. Трэба ўмацоўваць рэгіянальны напрамак», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

У сваю чаргу Манфрэд Хутэрэр падтрымаў агучаныя ініцыятывы аб інтэнсіфікацыі інвестыцыйнага супрацоўніцтва. «Нашы адносіны сапраўды на ўздыме, можна сказаць, што адкрылася добрае «акно магчымасцяў», якім мы павінны скарыстацца», — заявіў ён.

На думку пасла, нямецкім кампаніям трэба больш ведаць пра Беларусь. Прапрацоўваецца магчымасць правядзення ў Германіі сумеснага бізнес-форуму, дзе плануецца прэзентаваць інвестыцыйны патэнцыял нашай краіны.

Падчас перагавораў бакі абмеркавалі вынікі праведзенага ў Мінску ў верасні 2019 года Дня нямецкай эканомікі. Манфрэд Хутэрэр таксама паведаміў аб намерах упершыню арганізаваць у Беларусі ў 2020 годзе Дні нямецкай навукі. Міхаіл Мясніковіч гэтую ідэю падтрымаў.

# ПРАБЛЕМЫ, ЯКІЯ ТУРБУЮЦЬ

**Іх агучылі жыхары Гродзеншчыны падчас прамой лініі са старшынёй абласнога Савета дэпутатаў Ігарам ЖУКОМ. Усяго было некалькі дзясяткаў званкоў. Пераважная большасць зваротаў — ад гродзенцаў. Змаглі дазваніцца і жыхары іншых раёнаў. У асноўным агучваліся жыллёва-камунальныя праблемы: у пачатку ацяпляльнага сезона не ўсё ішло гладка, і людзі хацелі ведаць, чаму так адбываецца.**


Фота «Гродзенская праўда».

Менавіта гэта тэма стала дамінантай у тэлефонных дыялогах Ігара Жука з жыхарамі вобласці. Гараджане выказвалі занепакоенасць перабоямі з цяплом у кватэрах. Да таго ж, праблема, як відаць, больш закранула Занёманскую частку горада — менавіта адтуль было шмат званкоў. Часцей за ўсё людзі пыталіся: калі ж у іх дамы прыйдзе цяпло? Як аказалася, не ўсе бачаць розніцу паміж рэжымам працеплівання і паўнавартаснай падачай цяпла.

— Пытанне ўзнікае яшчэ і таму, што многія блытаюць гэтыя працэсы. А між тым паміж рэжымам працеплівання і ўключэннем поўнага ацяплення ёсць значная розніца. Гэта нават розныя рэчы. Калі пачынаецца паўнавартасны рэжым, тэмпература вады ў батарэях дасягае 63—64 градусаў. А вось працепліванне прадугледжвае значна меншы нагрэў — толькі 34—40 градусаў. Пры замаразках можа быць і больш — да 50-ці. Пакуль сістэмы ацяплення жыллёвага фонду, згодна з распараджэннем старшыні гарвыканкама, знаходзяцца ў рэжыме працеплівання, — растлумачыў сітуацыю Ігар Жук.

Не ўсюды хутка была праведзена работа па распаветрыванні батарэй, ад чаго цяпло не магло трапіць у кватэру альбо ye частку. Таксама на падачы цяпла адбілася пракладка цеплатрасы. У горадзе такія работы яшчэ вядуцца поўным ходам.

Былі агучаны іншыя праблемы, у тым ліку транспартныя. Жыхарка вёскі Зялёная Гродзенскага раёна паскардзілася, што ў вёсцы няма аўтобуснага прыпынку. А жыхары абласнога цэнтра выйшлі з прапановай пасадзейнічаць у падаўжэнні аднаго з аўтобусных маршрутаў, які курсіруе ў загарадны мікрараён. Ёсць праблема і з разваротнай пляцоўкай.

Актуальную для асобна ўзятага двара тэму ўзнялі жыхары адной з цэнтральных вуліц горада. Высветлілася, што на месцы дзіцячай пляцоўкі будзе абсталявана паркоўка. Бацькі, чые дзеці тут гуляюць, супраць такога рашэння і маюць намер адстойваць дзіцячы аб'ект. Пытанне адрасавана гарвыканкаму. Ігар Жук таксама прыме ўдзел у абмеркаванні гэтай праблемы.

Увогуле пытанні гучалі самыя розныя, але злабадзённыя. Некаторыя абаненты эмацыянальна выказваліся аб сваіх праблемах, бо часта з імі сутыкаюцца. Гэта датычылася асфальтавання і рамонту дарог, выплаты пенсій, кошту лекаў, работы грамадскіх лазняў. На жаль, многія з іх зачыняюцца...

Як адзначыў Ігар Жук, большасць пытанняў вырашалася аператыўна на месцы пры дапамозе прадстаўнікоў кампетэнтных службаў і ўпраўленняў. Некаторыя праблемы патрабуюць больш падрабязнага вывучэння. Кожны заяўнік можа мець упэўненасць, што яго пытанне будзе вырашацца з удзелам адпаведных службаў, адзначыў Ігар Жук. Пісьмовы адказ атрымаюць усе, хто звярнуўся на прамую лінію.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ВЫСЛУХАЦЬ, ЗРАЗУМЕЦЬ, ДАПАМАГЧЫ

**Каля трыццаці званкоў ад жыхароў цэнтральнага рэгіёна паступіла на прамую тэлефонную лінію, што правяла старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ.**



Жыхара вёскі Лежні Чэрвеньскага раёна Багдана Міхайлавіча хвалявалі транспартныя праблемы. Заяўнік расказаў, што раней да райцэнтра можна было дабрацца аўтобусам, які курсіраваў па панядзелках. Цяпер рэйс знялі. А найбліжэйшы аўтобусны прыпынак знаходзіцца дзесьці за пяць кіламетраў ад населенага пункта. Падчас дыялогу высветліліся і іншыя пытанні, якія патрабуюць вырашэння. Адно з іх — рамонт дарогі. Аналагічныя праблемы агучылі і жыхары вёскі Зайцы гэтага ж раёна.

Наталля Якубіцкая патэлефанавала старшыні Чэрвеньскага раённага Савета дэпутатаў Мікалаю Лойку і даручыла правесці агульны сход жыхароў з запрашэннем кіраўнікоў усіх зацікаўленых службаў, у тым ліку і транспартнай арганізацыі, якая ажыццяўляе пасажырскія перавозкі.

Алена Станіславаўна з вёскі Пекалін Смалявіцкага раёна звярнулася з просьбай пасадзейнічаць у рамонце мясцовага фельчарска-акушэрскага пункта. Будынак медыцынскай установы стары, выглядае непрывабна, паскардзілася жанчына. Акрамя таго, у дрэнным стане вуліца Калгасная: пасля дажджу — не праехаць.

Наталля Якубіцкая звязалася з галоўным урачом Смалявіцкай цэнтральнай раённай бальніцы Вольгай Уваравай, якая запэўніла, што пытанне вырашыцца ў 2020 годзе. У бюджэце на гэтыя мэты будуць прадугледжаны неабходныя сродкі. Што датычыць дарогі, то пытанне па яе ўладкаванні адрасавана намесніку старшыні Смалявіцкага райвыканкама Мікалаю Паранонаву.

Жыхароў Прылукаў Мінскага раёна непакоіць адсутнасць гарачай вады. Пасля таго як уключылі ацяпленне, яна ў кранах прапала. У тым выпадку, калі яе доўга спускаць, яна становіцца крыху летняй, але да неабходнай тэмпературы — далёка. Грамадзян з вёскі Навасады Барысаўскага раёна не задавальняе якасць пітной вады. «Такія праблемы сапраўды характэрныя для некаторых населеных пунктаў гэтага рэгіёна, і мы пра іх ведаем», — канстатавала Наталля Якубіцкая. Яна даручыла кіраўніцтву раёнаў і кампетэнтным службам пастарацца дапамагчы людзям.

У аграгарадку Калодзішчы распачаўся рамонт вуліцы Цяністай і прылеглых да яе праездаў. Але некалькі жыхароў выказаліся супраць толькі асфальтавання, расказаў Уладзіслаў Васілевіч. Яны патрабуюць, каб правялі комплекснае добраўпарадкаванне з азеляненнем тэрыторыі, уладкаваннем тратуараў. Дарожнікі вымушаны былі прыпыніць работы.

Высветліць сітуацыю і дапамагчы жыхарам знайсці кампраміс Наталля Якубіцкая даручыла першаму намесніку старшыні Мінскага райвыканкама Уладзіміру Юргевічу.

На прамую лінію паступалі і званкі накont вулічнага асвятлення ў асобных населеных пунктах.

— Людзей можна зразумець, — канстатавала старшыня аблсавета. — Пачынае позна развідняцца, рана цямнець. Трэба, каб дарослым было зручна дабірацца на работу і дамоў, а дзецям у школу. У прынцыпе, з мінулага панядзелка многія пачалі ўключаць святло, ставіць дадатковыя ліхтары. Мы ўзмацнілі работу ў гэтым кірунку і трымаем пытанне на кантролі. У самы бліжэйшы час яно будзе знятае з парадку дня.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# І ЧАМУ ДОМА ЯШЧЭ ХОЛАДНА?


Прамая лінія старшыні Віцебскага аблсавета.

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ у мінулую суботу падчас прамой лініі выслухаў больш за дзесяць зваротаў грамадзян. Трохгадзіннае «дзяжурства» народнага выбранніка часта нагадвала... фіксаванне званкоў у дыспетчарскай падраздзялення жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Агучанай праблемай нумар адзін стаў недахоп цяпла ў жыллі.**

Некалькі чалавек з розных рэгіёнаў Прыдзвіння прасілі дапамагчы падняць тэмпературу вады ў батарэях. У прыватнасці, скардзілася на холад жыхарка дома на вуліцы Пушкіна ў Оршы. А па сутнасці — няўжо, каб спусціць паветра са стаяка, трэба тэлефанаваць у Віцебск? Напэўна, мясцовыя камунальнікі, мякка кажучы, ходзяць на работу «з-пад палкі»?

Аналагічная скарга была агучана і жыхаркай шматпавярховіка на праспекце Фрунзе ў абласным цэнтры. У доме работнікі сістэмы ЖКГ чамусьці не спяшаюцца распачаць ацяпляльны сезон. Дзіўна, калі ўлічыць, што зарплату атрымліваюць без затрымак.

Але некаторым трэба дапамагчы зберагчы цяпло. Накont уцяплення фасада часткі дома на вуліцы 1-й Пралетарскай, якое абмінула яе кватэру, тэлефанавала яшчэ адна віцяблянка. А жыхарка Маскоўскага праспекта ў Віцебску, як запомніў дэпутат, не першы раз прасіла паспрыяць паскарэнню капітальнага рамонту дома. Па яе словах, сур'ёзны рамонт будынка за 56 гадоў ні разу не выконваўся. Яна атрымала адказ, што, калі ёсць падстава, рамонт паскораць.

Вельмі абгрунтаванай была просьба яшчэ адной віцяблянкі накont неабходнасці арганізацыі праезду грамадскага транспарту да новай паліклінікі. Жанчына жыве ў спальным раёне Білева, а да іншага — Медцэнтр, дзе адкрылі сёлета медыцынскую ўстанову, паводле яе слоў, дабірацца нязручна. Старшыня абласнога Савета паабяцаў разабрацца з сітуацыяй і даў даручэнне адказным асобам аператыўна прадумаць і рэалізаваць на практыцы лагістыку. А, калі задумацца, насамрэч: калі адкрываюць установу сацыяльнага прызначэння для жыхароў канкрэтных раёнаў, трэба ж паралельна аналізаваць: ці зручна будзе дабірацца туды параўнальна здалёк? Не ва ўсіх жа ёсць аўто, тым больш у пенсіянераў, маці-адзіночак.

Жыхарка Браслаўскага раёна папрасіла паспрыяць абследаванню стану яе здароўя ў абласным цэнтры. Пры гэтым, што важна, шчыра падзякавала за спачуванне і падтрымку тутэйшым медыкам. Пытанне будзе вырашана станоўча, паведаміў дэпутат карэспандэнту «МС», бо падтрыманне ў належным стане працаздольнасці і даўгалецця грамадзяніна — гэта не толькі асабістая справа, але і клопат дзяржавы.

А вось састарэлы жыхар Верхнядзвінскага раёна прасіў станоўча вырашыць пытанне падвозу яго дачкі да работы і дамоў. Яна скончыла Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, цяпер — малады спецыяліст. Безумоўна, аргументаванасць пытання спрэчная, але ж трэба, як кажуць, вывучыць сітуацыю дэталёва.

Падводзячы вынікі прамой лініі, старшыня абласнога Савета адзначыў, што, бадай, усе заявы знаходзяцца ў кампетэнцыі адказных асоб на месцах — у прыватнасці, тыя ж камунальныя сігналы. Пры гэтым важна было чарговы раз атрымаць пацвярджэнне таго, што людзі вераць у больш дзейснае рэагаванне на зварот да народнага выбранніка. Гэта, безумоўна, дарагога каштуе.

Кіраўнік аблсавета не раз нагадваў калегам у глыбінцы, што дробных пытанняў ад грамадзян не бывае. Таму кожны сігнал на прамую лінію будзе разгледжаны, а праблемы пры магчымасці — вырашаны.

***P.S.***

*Накont скаргаў пра холад у жыллі: усе сігналы былі аператыўна перададзены ў падраздзяленні ЖКГ, якія абслугоўваюць кватэры заяўнікаў. І, сантэхнікі доўга не зацягваючы, зрабілі ўсё, што было трэба.*

*Практыка паказвае, што ў большасці выпадкаў трэба толькі правяць больш прафесіяналізму на месцах. Напрыклад, праверыць, ці ва ўсіх кватэрах нармальна цыркулюе вада ў сістэме ацяплення: калі трэба ў дзень падключэння, спусціць паветра па стаяку і г. д. У сувязі з падаражаннем паслуг ЖКГ павышаецца і патрабавальнасць карыстальнікаў да іх якасці. Таму можна зразумець аргументы людзей.*

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

# АГУЛЬНЫ ДВОР. АГУЛЬНЫ ПАРК.

## Як праект КАМГОР пасадзейнічаў экалагічнаму і эфектыўнаму кіраванню гарадскім асяроддзем —

**Чалавек не выбірае, дзе яму нарадзіцца. Але ён можа выбраць месца жыхарства і, галоўнае, зрабіць свой горад ці вёску камфортнымі і зручнымі. У гэтым змаглі пераканацца жыхары трох беларускіх гарадоў — Магілёва, Баранавічаў і Чавусаў — падчас рэалізацыі праекта «Камунальнае кіраванне ў гарадах (КАМГОР): камунікацыі і кіраванне для ўцягвання грамадскасці ў кіраванне гарадской гаспадаркай у Беларусі». Ён выконваўся з 2015 да 2019 года пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза.**

Мэта праекта — на прыкладзе трох беларускіх гарадоў паказаць, як можна палепшыць сістэму кіравання гарадской гаспадаркай, садзейнічаць укараненню прынцыпаў зялёнага горадабудаўніцтва і павысіць якасць жыцця гараджан за кошт эфектыўнага супрацоўніцтва мясцовых органаў улады і насельніцтва — партнёрскага кіравання.

Выдатныя вынікі такога супрацоўніцтва дэманструюць многія гарады ў Заходняй Еўропе, а таксама ў суседніх з намі краінах Прыбалтыкі. Таму ў тым ліку і на аснове замежнага вопыту ў беларускіх гарадах паспрабавалі рэалізаваць пілотныя ініцыятывы з абавязковым удзелам на розных этапах як адміністрацый гарадоў, так і гараджан. Што з гэтага атрымалася?

### «ЗЯЛЁНАЯ» ГІСТОРЫЯ

На працягу некалькіх гадоў гарадскія ўлады Магілёва і неабыякавая грамадскасць развівалі ідэю добраўпарадкавання парка Падмiколле — гістарычнага месца, дзе першапачаткова фарміраваўся горад. Была нават створана грамадская ініцыятыва, каб забяспечыць удзел гараджан у праектаванні паркавай зоны. А дзякуючы праекту КАМГОР стала магчымым аб'яднаць намаганні адміністрацыі і грамадскасці, адпрацаваць механізм сумеснага прыняцця рашэнняў.

— Каб вызначыцца, што ж зрабіць на гэтым месцы, былі сабраныя прапановы гісторыкаў, архітэктараў, грамадскасці, выканкама, прадстаўнікоў канфесій — каб уліччыць пажаданні максімальнай колькасці людзей, для якіх гэты аб'ект уяўляе інтарэс, — расказала **эксперт праекта КАМГОР у Магілёве Таццяна АСМАЛОЎСКАЯ.** — Было важна захаваць у цэнтры горада не толькі зялёную зону, але і гістарычную частку.

Для гэтага на пачатку рэалізацыі пілотнай ініцыятывы «Азеляненне тэрыторыі гарадскога парка Падмiколле на этапе планавання вырашылі аднавіць гістарычныя назвы вуліц і завулкаў, якія раней існавалі ў Магілёве. Такія дарожкі-вуліцы з адпаведнымі паказальнікамі з'явіліся ў парку.

Летам 2019 года ў Падмiколлі за Свята-Мікольскім манастыром адкрылі зону ціхага адпачынку. Папярэдне там высадзілі каля дзвюх тысяч дрэў і кустоў з захаваннем гістарычнага грунту. Сёння ў парку знаходзіцца лесвіца з каскадным фантанам, зоны адпачынку для дзяцей, дарожкі для прагулак матуль з калясками, пешаходныя і веладарожкі. На месцы гарадскога вала створана алея, разбіты фруктовы сад, закладзены бэзоўнік. Нягледзячы на тое, што дрэвы і кусты ў парку яшчэ дастаткова маладыя, месца стала папулярным сярод гараджан.

— Падчас абмеркавання праекта азелянення парку мы ўпэўніліся, што грамадства не бачыць праблем адміністрацыі горада, а адміністрацыя — грамадства, — адзначыла Таццяна Асмалоўская. — Мы не вельмі добра ўмеем данасіць свае пытанні і праблемы, не ўлічвалі моманты, што некаторыя рэчы нельга зрабіць хутка. Але калі ішлі на дыялог, не было выпадкаў, каб мы аб чымсьці не дамовіліся.

**Начальнік аддзела ЖКГ Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта Ігар ДАНЬКОЎ** упэўнены: у рэалізацыі праекта вельмі дапамаглі ўдзел зацікаўленых бакоў у семінарах, якія праходзілі на тэрыторыі Беларусі, а таксама паездкі ў Германію і Латвію, падчас якіх прадстаўнікі гарадскіх адміністрацый азнаёміліся з вопытам работы мясцовых улад з грамадскасцю. Усё гэта паспрыяла больш эфектыўнай рэалізацыі праекта.

Сёння парк знаходзіцца на балансе «Магілёўзеленбуда», і, дзякуючы грамадскасці і мясцовым арганізацыям, паступова развіваецца.

### АД ІДЭІ ДА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ

Праблема добраўпарадкавання тэрыторый у новых мікрараёнах актуальная для многіх гарадоў Беларусі. Не абышла яна і Баранавічы — буйны прамысловы цэнтр у Брэсцкай вобласці з насельніцтвам каля 180 тысяч чалавек. Паколькі аб'екты інфраструктуры ў горадзе размешчаны нераўнамерна, не ўсе яго жыхары маюць хуткі доступ да гульнявых, спартыўных пляцовак, зручных месцаў адпачынку.

Для аднаго з куткоў горада гэтую праблему дапамагла вырашыць рэалізацыя ініцыятывы «Добраўпарадкаванне шматфункцыянальнай спартыўна-гульнявой пляцоўкі па вуліцы Прамысловай у горадзе Баранавічы». Пляцоўка адкрылася 29 чэрвеня 2018 года.

Там былі створаны пляцоўкі для пляжнага футбола і валейбола, баскетбольнае поле для трэніровак, сектар гімнастычнага абсталявання, выкладзены пешаходныя дарожкі, размешчаны малыя архітэктурныя формы, лаўкі ды іншае.

Але перад стварэннем аб'екта планы добраўпарадкавання тэрыторыі абмяркавалі з мясцовым насельніцтвам. Было прапанавана некалькі варыянтаў, і гараджане спыніліся на спартыўным кірунку.

Жыхары мікраёна і іншая грамадскасць удзельнічалі не толькі на этапе абмеркавання. Яны таксама займаліся добраўпарадкаваннем пляцоўкі, а з дапамогай сродкаў праекта КАМГОР усталёвалі агароджу паміж пляцоўкай і аўтастаянкай магазіна, аўтаномнае асвятленне і відэаназіранне.

— Гэты праект стаў для нас добрым вопытам зносін як з замежнымі калегамі, так і з мясцовым насельніцтвам, — сказаў **намеснік старшыні Баранавіцкага гарвыканкама Дзмітрый ЦІХНО.** — Мы працягнулі раіцца з гараджанамі наконт далейшага развіцця горада. Іх прапановы ўвайшлі ў праект рэканструкцыі так званага маладога парку і ў план стварэння парку ў мікраёне Броўкі.

Тое, што прадстаўнікі гарадской адміністрацыі бралі ўдзел у навучальных паездках у Германію і Латвію, у семінарах на тэрыторыі Беларусі, адыграла сур'ёзную ролю ў актывізацыі ўзаемадзеяння з грамадскасцю, упэўнены **эксперт праекта КАМГОР у Баранавічах Уладзімір ЗУЕЎ.** Да гэтага многія не разумелі, што асобы, якія прымаюць рашэнні, павінны дзейнічаць не толькі

> У рамках праекта была створана платформа «Агульны горад» для абмену вопытам і ведамі па стварэнні ўстойлівага, камфортнага гарадскога асяроддзя. Распрацаваны інтэрактыўныя карты, якія дазваляюць кожнаму жыхару даведвацца і дадаваць інфармацыю аб найбольш цікавых месцах горада, мясцовых праблемах, а таксама прапаноўваць новыя тэмы для стварэння агульнай гарадской прасторы.

# Чаму вы тут жывяце?

**Гэтае пытанне жыхары Хойнікаў чуюць вельмі часта. Задаюць яго звычайна тыя, хто здалёк прыязджае ў гарадок на поўдні Беларусі. Тыя, хто сапраўды пераадолелі свае фобіі, сфатаграфаваліся на фоне знака радыяцыйнай бяспекі і паставілі ў сацсетках хэштэг, накшталт #chernobyl#stalker#radioactive.**

Мясцовыя толькі ўсміхаюцца, бо прызвычаіліся да пытанняў, напрыклад, вынесенага ў загаловак і незвычайнай увагі за 33 гады пасля аварыі на ЧАЭС. Даўно жыхароў Хойніцкага, Брагінскага, Нараўлянскага і іншых забруджаных раёнаў не называюць «чарнобыльскімі вожыкамі», не баяцца дакрануцца як да заразных. Цяпер сюды ўсё часцей едуць навукоўцы і чыноўнікі з розных краін набываць унікальны досвед бяспечнага жыцця ва ўмовах радыеактыўнага забруджвання.

Размова ўжо ідзе пра тое, што Беларусь на міжнародным узроўні можа пазіцыянаваць сябе як краіну-эксперта ў галіне пераадолення наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. **Начальнік упраўлення па праблемах ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый РУТКОЎСКІ** нагадвае, што за 33 гады ўзровень радыеактыўнага забруджвання паменшыўся ўдвая.

— З 1986 года было выведзена з абароту 265 тысяч гектараў зямель, а за апошнія гады вернута 19 тысяч гектараў. Навукоўцы распрацавалі тэхналогіі, якія дазваляюць вырошчваць на гэтых палях пэўную прадукцыю. Яны даюць рэкамендацыі, якім чынам яе выкарыстоўваць.

За падрабязнасцямі ў невялічкі гарадок Хойнікі — адзін з найбольш пацярпелых ад радыяцыі, прыязджаюць цяпер і з Японіі. Пасля аварыі 2011 года на Фукусіме сюды наведалася больш за чатыры дзясяткі дэлегацый з Краіны ўзыходзячага сонца. Іх цікавяць не толькі распрацоўкі вучоных і сельскагаспадарчыя тэхналогіі, але і работа з насельніцтвам. Гавораць, у невялічкай краіне сорамна нават прызнацца, што ты жывеш у прэфектуры Фукусіма. У нашых людзей — тых, хто не пакінуў гэтыя мясціны ў самыя складаныя гады, страху цяпер няма. Нашы ведаюць, дзе небяспека і з задавальненнем параяць іншым, як жыць і не баяцца.

У Хойніцкім раёне цяпер жыве больш за 19 тысяч жыхароў. Сярод іх тыя, хто ад'язджаў і паспытаў шчасця ў іншых мясцінах. Тыя, хто прыехаў з вельмі аддаленых куткоў былога Саюза — бо палічылі, што тут небяспека меншая, чым там, дзе страляюць ці здзекуюцца. Прадстаўнікі 16 нацыянальнасцяў прыжыліся ў гэтым краі лясоў і балот.

Пра багну тут успамінаюць часцяком. Палескія балоты — лёгкія Еўропы, якія апаэтызаваў Іван Мележ у сваіх творах, вельмі пацярпелі ў 60—70-я гады мінулага стагоддзя. Тады на Беларусі была праведзена шырокамаштабная меліярацыя. З ёй звязваюць і сыход грунтовых водаў, што прыводзіць цяпер да працяглых засух на Палессі. Дык вось, ужо два з паловай дзесяцігоддзі гэтыя цяпер запаведныя мясціны штучна затапляюцца, расказвае **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка Максім КУДЗІН:**

— З 1993 года на гэтай тэрыторыі былі праведзены інтэнсіўныя работы па падтапленні зоны. Каб не дапусціць сцёк радыенуклідаў праз меліярацыйную сетку ў Прыпяць і Дняпро.

Прырода шчыра аддзячвае. Чарапахі, зубры, ласі, алені, коні Пржавальскага, рысі, мядзведзі, птушкі размнажаюцца ва ўмовах, калі чалавек не спакушаецца на іх жыццё і не заходзіць на іх тэрыторыю. А людзі прытрымліваюцца некаторых правілаў, якія не так моцна ўплываюць на штодзённае існаванне, як асобным здаецца. Так, напрыклад, усе ведаюць, што нельга збіраць дзікарослыя грыбы і ягады, бо яны больш за іншыя расліны назапашваюць шкодныя рэчывы.

Між тым мясцовыя прызнаюцца, што ў лес усё ж з кошыкамі ходзяць. Праўда, потым абавязкова зліваюць двойчы ваду — калі вараць грыбы. Пасля правяраюць на радыяцыю. Ну а калі праверылі і ўсё роўна «фаніць» — з жалем, але выкідаюць. Здароўе — даражэйшае. Але ж, гавораць, што так бывае рэдка. Дарэчы, персанальныя дазіметры ёсць тут далёка не ва ўсіх.

Гэта заезджыя спрабуюць разабрацца пра ўнутранае і знешняе выпраменьванне, пра кюры і зіверты. Мясцовыя давяраюць навукоўцам, якія распрацавалі нескладаныя правілы паводзінаў: мыць рукі і прадукты, не есці лясныя дары, не хадзіць там, дзе ўсталяваны знакі небяспекі... Цяпер любы хойніцкі першакласнік раскажа вам пра гэта. А яшчэ завядзе ў сваю школу, дзе ёсць лабараторыі для праверкі прадуктаў харчавання. Бясплатна гэта можна зрабіць і на ўсіх прадпрыемствах раёна.

Некалі ў горадзе, як і ў іншых пацярпелых населеных пунктах, быў зняты грунт на 15—20 сантыметраў. Тую зямлю захавалі асобна. Дэзактывацыя дала плён, але ж і цяпер санітарныя службы замеры робяць штодзень. Ну а штогод жыхары пацярпелых раёнаў праходзяць абавязковую дыспансерызацыю ў найлепшых медыцынскіх установах краіны. РНПЦ радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека створаны менавіта для таго, каб аказваць спецыялізаваную дапамогу насельніцтву, пацярпеламу ад катастрофы на ЧАЭС.

Хойніцкі раён развіваецца актыўна. У тым ліку ствараюцца фермерскія гаспадаркі, дзе вырошчваюць тыя расліны, што не накопліваюць радыенукліды. Самымі папулярнымі апошнім часам сталі маліны і дурніцы. Яны тут, на поўдні, паспяваюць раней, чым дзе. Таму можна і на рынках першымі каштоўныя ягады прадаць — па самай высокай цане. Гавораць, што будуць спрабаваць вырошчваць і бахчавыя культуры.

Відаць, тыя, хто застаўся жыць на Гомельшчыне, навучыліся ставіцца з аптымізмам і гумарам да таго, што дадзена лёсам.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ,**
*г. Хойнікі.*

## Тэлесеткі

# «Кулінарная дыпламатыя» ў рытме самбы

**З 12 кастрычніка праграма «Кулінарная дыпламатыя» на тэлеканале «Беларусь 1» пачне выходзіць з новым вядучым — Віталем Водневым. Ён па чарзе са сваёй калегай па праекце Натальяй Рыжанковай будзе знаёміць тэлеаўдыторыю з нацыянальнымі стравамі і культурай розных краін свету.**

Гасцямі праграмы ў новым тэлесезоне будуць не толькі паслы замежных дзяржаў у Беларусі, але і беларускія дыпламаты, бізнесмены і дзеячы культуры, якія ствараюць імідж нашай краіны за мяжой і наладжваюць сувязі з партнёрамі. Таксама на кухню тэлепраекта зазірнуць дзеячы з іншых краін, якія «ўпісваюць» часцінку каларыту сваёй радзімы ў беларускую сучаснасць.



Ужо 12 кастрычніка Віталь Водневу трапіць на сапраўдны бразільскі карнавал эмоцый, калі на кухню «Кулінарнай дыпламатыі» завітае прафесійны інструктар па танцах з Рыа-дэ-Жанэйра Марсія Мандава. Яна з'яўляецца адным з арганізатараў міжнароднага стрыт-арт-фестывалю Vulica Brasil у Мінску. Падчас эфіру вядучы з госцяй у рытме самбы прыгатуюць нацыянальную страву Galinha zambeziana і бразільскі пудынг, а таксама пагавораць пра футбол і серыялы.

— Калі госці ўсміхаюцца і з лёгкасцю ідуць на дыялог, як Марсія, то гісторыі пра іх родныя мясціны атрымліваюцца цікавыя і жывыя, — дзеліцца ўражаннямі Віталь Водneў і дадае: — Увогуле я даўно марыў працаваць менавіта ў кулінарным праекце. Хоць сам гатую не вельмі часта, але цікаўлюся стравамі розных краін і мне падабаецца быць на кухні ў добрай кампаніі. А ў нас на праекце сабралася якраз такая творчая каманда.

Нагадаем, праграма «Кулінарная дыпламатыя» выходзіць па раніцах у суботу на тэлеканале «Беларусь 1». Праект змяніў графічнае афармленне, а ў хуткім часе новую «ўніформу» прымераць таксама вядучыя і госці праекта.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ («Звязда»)

**Выпуск № 98**

У сталіцы Кот-д'Івуара Ямусукра завяршыўся чэмпіянат свету па міжнародных шашках сярод мужчын. Чэмпіёнскі тытул дзясяты раз заваяваў расійскі гросмайстар Аляксандр Георгіеў. Прадстаўнік Беларусі гросмайстар Міхаіл Семянюк фінішаваў на 15-м месцы. Паглядзіце цікавыя фрагменты гульні ўдзельнікаў.

**№ 65 Санага — Сілва**

**Белыя простыя шашкі:** 25, 27, 28, 32, 33, 35, 37, 38, 45 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** 12, 13, 14, 16, 19, 20, 21, 23, 34 (9).

1. 3329? Белыя неасцярожна напалі, пасля чаго адбыўся непрыкметны ўдар на большасць. Пакажыце яго.

**№ 66 Суарэ — Семянюк**

**Белыя простыя шашкі:** 24, 27, 29, 31, 32, 34, 35, 37, 38, 39, 41, 43, 46, 47, 48, 49 (16).

**Чорныя простыя шашкі:** 3, 6, 8, 9, 11, 12, 13, 15, 16, 17, 18, 20, 21, 22, 23, 26 (16).

На 1...914? Белыя правялі нескладаны удар 2. 3228 2242 3. 4738 2132 4. 3710+

Для самастойнага рашэння прапануем кампазіцыі па шашках-64, складзеныя мінскімі аўтарамі.

**№ 67 В. Шульга (Мінск).**



**Белыя простыя шашкі:** g1, b2, d4, c5, g5, f6, c7 (7).

**Чорныя простыя шашкі:** f2, e3, g3, h4, a5, h6, f8 (7).

**№ 68 І. Наўроцкі**

**Белыя простыя шашкі:** a5, b2, c1, c3, c7, d2, e1, g3, h6 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** b6, d8, e5, f2, f4, f6, f8, g7, h2 (9).

**№ 69 Э. Дамброўскі**

**Белыя простыя шашкі:** e1, g1, a3, c3, e3, g3, d4, f4, g5 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** h2, c5, b6, d6, a7, e7, g7, b8, f8 (9).

Праверце свае рашэнні: Выпуск № 97 ад 27.09.19.

№ 61 1.b6-c7 b8xb4 2. a7-b8 f4xd2 3. b8xh2+

№62 1. c3-b4 x40/51 — 0.19 g1xf8 -x47/51 — 0.33 2. d2-e3 x39/51 — 0.03 f4xd2 3. b4-c5 x23/51 — 0.03 f8xb4 4. a5xe1 x27/51 — 0.05 g5-f4 -x22/51 — 0.06 5. e1-f2 x8/51 — 0.02 a7-b6 -x7/51 — 0.02 6. a3-b4

№ 63 1. f4-e5 x14/51 — 0.29 f6xd4 2. c5xc1 a7xc5 3. a3-b4 x10/51 — 0.02

[3.c1-d2 c5-d4]

3 ...c5xa3 4. c1-d2 x8/51 — 0.01 h6-g5 5. d2-e3 g5-h4 6. e3-f4

№ 64 1. 2721 1728 2. 4301 3443 3. 4439 2534 4. 0145 4334 5. 4546+

Першымі дакладныя адказы даслалі С. Бурко (Орша), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва Мядзел), У. Статкевіч (пасёлак Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцвінаў (усе Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013,*

*e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Сядзі і глядзі

# Прыярытэты на ўсе часы...

**«Мне б у неба» — трагікамедыйны мастацкі фільм Джэйсана Райтмана, які ўбачыў свет у 2009 годзе. Знятая па аднайменным рамане Уолтэра Кёрна, гэтая кінакарціна была названая саветам кінакрытыкаў ЗША найлепшым фільмам года.**



Здымкі «Мне б у неба» праходзілі ў Дэтройце, Лас-Вегасе, Маямі, Амасе і Сент-Луісе, ЗША. «Мы здымалі ў пяці гарадах, якія адлюстроўваюць дванццаць, — дзяліўся пасля ў інтэрв'ю рэжысёр. — Наш мастак-пастаноўшчык паказаў сябе сапраўдным геніем, калі, бывала, размяшчаў пяць розных гарадоў у адным будынку. Мы хадзілі з паверха на паверх, перасякаючы пры гэтым кантынент. Разам з тым мне хацелася, каб перамены адчуваліся кожны раз, як наш герой прызямляецца ў новым месцы. Вось вы ў Маямі, побач акіян, а ў наступнае імгненне — у Дэтройце, і мяце снег. Я хацеў, каб адчувалася змена клімату, абставін, каб усё змянялася ад горада да горада — асвятленне, вопратка, антураж».

Кінастужка расказвае гледачам гісторыю амерыканскага юрыста Раяна Бінэма, сутнасць работы якога — паведамляць людзям, што іх звольнілі. Вядома, такія звесткі многіх абураюць і нават выклікаюць разгубленасць і слёзы. Таму нашаму герою неабходна выказаць спачуванні, спадзеючыся, што такім чынам былыя супрацоўнікі не пойдуць у суд. Аднак і для самога Бінэма (ролю выконвае Джордж Клуні, вядомы па ролях у серыяле «Хуткая дапамога», фільмах «Сірыяна», «Адзінаццаць сяброў Оўшэна» і іншых ) работа — адзінае, што ёсць у яго жыцці. Бясконцыя сустрэчы з супрацоўнікамі, пералёты і мімалётныя знаёмствы з жанчынамі — усё, чым запоўнены будні і святы мужчыны. У вобразе гэтага героя вельмі дакладна счытваюцца рэаліі сённяшніх дзён, калі асноўны час прысвячаецца працы, а іншыя сферы, у тым ліку і сям'я, уключаючы ў распарадак па астатковым прынцыпе.

Паваротнымі момантамі, якія змяняюць жыццё нашага героя і яго стаўленне да рэчаіснасці, становяцца сустрэча з незвычайнай жанчынай Алекс (Вера Фарміга) і сутыкненне з маладой калегай Наталі (Анна Кендрык). У выпадку з першай ён пачынае задумвацца пра важнасць сям'і і кахання, а што да сітуацыі на рабоце, то там з'яўляецца ўсведамленне, як аднойчы ўсё можа змяніцца, і тады ўжо ты сам можаш апынуцца сярод беспрацоўных.

Вытрымкі з інтэрв'ю звольненых героеў кінакарціны «Без сяброў, без сям'і я не справіўся бы», «Справа не ў грашах, хоць з імі цёпла, можна аплаціць рахункі і купіць плед, але яны ніколі не сагрэюць мяне як мой муж», «Мне трэба прачнуцца раніцай, выбраць нешта і знайсці, бо я жыву дзеля сваіх дзяцей і сям'і» — нібы нататкі на палях, якія дапамагаюць у складанай сітуацыі. І мы самі робім выбар: рухацца нам з адным чамаданам з аэрапорта ў аэрапорт ці асесці на адным месцы, нарадзіць дзяцей і жыць у горы і ў радасці з дня ў дзень...

Як крытыкі, так і гледачы фільм успрынялі неадназначна. Нехта ацэньвае яго як простую гісторыю, а іншыя праводзяць паралелі з надзённымі праблемамі і бачаць метафары і пераканаўчую ігру герояў. Фільм наміраваўся ў шасці катэгорыях на «Залаты глобус», выйграў прэмію за найлепшы сцэнарый, меў таксама шэсць намінацый на прэмію «Оскар», але не перамог ні ў адной з катэгорый. Узяў чатыры прэміі Нацыянальнага савета кінакрытыкаў ЗША: як найлепшы фільм, найлепшая мужчынская роля (Джордж Клуні), найлепшы адаптаваны сцэнарый і найлепшая жаночая роля другога плана (Анна Кендрык).

Што ж, самы час запланаваць для сябе прагляд фільма на вечар пятніцы 18 кастрычніка. Чакайце сеанс на тэлеканале «Беларусь 2» у 23.15.

**Алена ДРАПКО.**

### Цікавыя факты

- За два месяцы да пачатку здымак Вера Фарміга другі раз стала мамай. І паколькі шрам ад кесарава сячэння ўсё яшчэ быў заўважны, то ў некаторых сцэнах актрысу замяняла дублёрша.
- У канспіратыўных мэтах 35-міліметровыя стужкі з фільмам былі адпраўлены ў кінатэатры пад назвай «Сідней».
- Калі б Джордж Клуні адмовіўся ад ролі, то яе перапісалі б пад Сціва Марціна і зрабілі б ухіл у бок сюжэта фільма «Цяжкасці перакладу» (2003).
- Большая частка людзей, якія з'яўляюцца ў фільме, зусім не акцёры, а простыя амерыканцы, хто застаўся без работы з-за крызісу. Іх сцэны здымаліся пад выглядам дакументальнага кіно.
- Уолтэра Кёрна, аўтара кнігі, паводле якой зняты фільм, таксама можна ўбачыць на экране. Ён іграе камеа і ў сцэне прадстаўлення Наталі сядзіць злева ад Раяна.

## Беларусь 1

6.25, 15.30 **Меладрама «Нецалодкая помста» (16+).**
8.15 Клуб рэдактараў (16+).
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал» (12+).
9.45 Гісторыі выратавання (12+).
10.25 «Усе за стол!» (12+)
11.15 Вакол планеты.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Маршрут пабудаваны (12+).
**13.15 Меладрама «Паляванне на вернага» (16+).**
15.15 Твой горад.
19.45 «На вылет!» (12+)
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
**22.10 Меладрама «Новы муж» (12+).**

## Беларусь 2

7.00 М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+)
**7.25 Фільм-казка «Кароль Дроздабарод» (6+).**
8.50, 19.35 Тэлебарометр.
8.55 «Кліч крыві» (16+).
10.10 «Селапаляцела» (16+).
10.45 «Да пабачэння» (16+).
11.35 «Багіня шопінгу. Бліскучае вяртанне» (16+).
**12.35 Трылер «Мюнхен» (16+).**
15.15 «Тата папаў» (16+).
17.45 «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
20.10 «Арол і рэшка. Перазагрузка» (16+).
21.10 Спортлата 5 з 36, КЕНО.
21.15 «Трэці лішні» (16+).
**22.20 Трагікамедыя «Мне б у неба» (16+).**
**0.10 «Калі мы дома». Скетчкам (16+).**

## Беларусь 3

7.35 «Казка пра рыбака і рыбку». М/ф (0+).
8.05, 14.40, 20.15 Навіны культуры.
8.25, 20.35 «Гэты дзень».
**8.30 «Першы тралейбус». Маст. фільм (12+).**
10.00 «Наперад у мінулае».
10.25 «Беларуская кухня». Цацні.
10.55 «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
Як жа пачаць выконваць гэту вельмі складаную работу? Па словах эксперта, перш за ўсё гарадской адміністрацыі важна не толькі ўмець аналізаваць сучасны стан развіцця горада, але і ацэньваць сваё магчымасці, а затым планаваць дзеянні ва ўзаемадзеянні з іншымі службамі горада, каб адно мерапрыемства дапамагала выканаць некалькі мэт у розных сферах. Такі інтэграваны падыход выкарыстоўваецца за мяжой, і найлепшыя яго практыкі знайшлі сваё адлюстраванне ў праекце «Зялёныя гарады».

Для трох пілотных гарадоў — Полацка, Наваполацка і Навагрудка — распрацаваныя Планы зялёнага горадабудаўніцтва да 2040 года. Яны былі зацверджаны мясцовымі Саветамі дэпутатаў.

План зялёнага горадабудаўніцтва — гэта мясцовая стратэгія ўстойлівага развіцця, распрацаваная з улікам асаблівасцяў гарадской прасторы і з удзелам насельніцтва, прадстаўнікоў бізнесу і грамадскіх арганізацый на ўсіх стадыях планавання. У яе ўваходзіць не толькі агульны погляд на будучыню горада, але і канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на дасягненне Мэт устойлівага развіцця, а таксама прыярытэтныя задачы, звязаныя з існуючымі ў горада рэсурсамі, і распрацоўваецца ўзгодненыя дзеянні, аснашчаныя індыкатарамі для маніторынгу і крыніцамі для фінансавання.

У кожнага горада планы маюць сваю спецыфіку.

Так, план «Навагрудак. Захаваем будучыню!» прадугледжвае прыцягненне інвестыцый у турыстычную галіну, развіццё сферы зялёных агратэхналогій, стварэнне безбар'ернага асяроддзя, паляпшэнне даступнасці гарадскіх аб'ектаў для бізнесу і адпачынку насельніцтва і многае іншае.

«Полацк. Навядзём масты» — так называецца план для горада над Заходняй Дзвіной. Тут плануецца не толькі ў фізічным сэнсе злучаць разарваныя ракой, чыгуначнымі пераездамі гарадскія раёны для паляпшэння транспартнай сувязі, у тым ліку і з суседнім Наваполацкам. Гэтыя гарады, на думку экспертаў, могуць стаць магутным лагістычным цэнтрам краіны — калі належным чынам сарыентаваць грузавыя патокі, яны прынеслі б гарадам працвітанне, і ў той жа час не пагаршалі б экалагічнага стану.

План «Наваполацк: зноў новы. Версія 2.0» прадугледжвае мадэрнізацыю, адыход ад монаарыентацыі горада на хімічную прамысловасць, развіццё няшкодных відаў вытворчасці, паляпшэнне транспартнай інфраструктуры, стварэнне вузлоў прыцягнення, у тым ліку пляцовак для адпачынку розных узроставых груп і іншае.

Каб на справе паказаць, як можа палепшыцца жыццё гараджан, каманда разам з зацікаўленымі бакамі ў кожным пілотным горадзе выбрала раёны, якія плануецца ў хуткім часе трансфармаваць згодна з прынцыпамі зялёнага горадабудаўніцтва. Гэта цэнтральная частка Навагрудка (раён вуліц Міцкевіча і Гродзенскай), мікрараён № 9 у Наваполацку і полацкі раён Грамы.

— Ужо прайшлі праектныя кансультацыі ў кожным горадзе, — расказала Вера Сысоева. — На сустрэчы з праекціроўшчыкамі запрашаліся жыхары і карыстальнікі раёнаў, каб даведацца, якія праблемы трэба вырашыць, што для іх важна і каштоўна. Да канца года плануецца атрымаць зацверджаныя эскізныя рашэнні для кожнага з раёнаў.

Акрамя Полацка, Наваполацка і Навагрудка, свае планы зялёнага горадабудаўніцтва ствараюць Карма, Зэльва, Гарадок і Крычаў.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

# Малако на біягазе

## Як у Кіраўскім раёне асвойваюць альтэрнатыўныя крыніцы электраэнергіі

**Самая буйная ў Беларусі і нават адна з маштабных у Еўропе біягазавая ўстаноўка функцыянуе сёння ў Кіраўскім раёне — у ААТ «Світанак». Яе магутнасць 4,8 МВт. Нядаўна да яе падключылі новую малочнатаварную ферму, пабудаваную з улікам апошніх інавацыйных падыходаў. Карэспандэнт «МС» пацікавілася, як засвойваецца біягаз з улікам новага аб'екта і якая карысць ад экалагічнага паліва гаспадарцы.**

Нагадаем, што комплекс па атрыманні біягазу будаваўся ў ААТ «Світанак» па дзяржпраграме развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі. Новая ферма дазволіла яшчэ больш загрузіць магутнасці біягазавай устаноўкі. Асноўныя работы па будаўніцтве фермы ўжо завершаныя. У склад малочнатаварнага комплексу ўваходзіць два асноўныя хлявы, даільна-малочны блок, радзільня з невялікай даільнай залай, цялятнік для ўтрымання цялят да трох месяцаў. Ферма новага пакалення абышлася не танна, але, як паказваюць вынікі, гэта таго вартае.

— Грошы дакладна ўкладзеныя не дарэмна, — пацвярджае **дырэктар ААТ «Світанак імя К. П. Арлоўскага» Аляксандр БАГЕЛЬ.** — Тыя перадавыя ідэі, якія былі тут выкарыстаны, даюць эфект. Малако атрымліваецца вельмі добрай якасці. Штодзённа тут надойваюць амаль 10,5 тоны. Па 29 літраў ад кожнай каровы.

Біягазавая ўстаноўка між тым дазволіла сэканоміць на будаўніцтве. Акрамя электраэнергіі яна выпрацоўвае яшчэ і цяпло. Цяпер яно цалкам ідзе на абагрэў новай фермы. Плюс падаецца ў якасці гарачай вады ў краны. Так што асобную кацельную для гэтых мэт будаваць не спатрэбілася.

А яшчэ за кошт таго, што ферма ўзводзілася ў непасрэднай блізкасці ад біягазавай устаноўкі, эканомія адбываецца яшчэ і на транспарціроўцы. Біягаз, як вядома, атрымліваецца з гною і здробненага кукурузнага сіласа. Па трубах біягаза трапляе з фермы на ўстаноўку.

— Сапраўды, біягазавая ўстаноўка — рэч добрая, — лічыць кіраўнік гаспадаркі. — Акрамя фермы частка цяпла ідзе на абагрэў цяпліц. Няшмат, але тым не менш, замяшчаецца прыродны газ. Цяпло ад біягазавай устаноўкі мы выкарыстоўваем на 100 %. І адпаведна на ім жа эканомім. А гэта ўсё немалыя грошы. За электраэнергію мы штомесяц атрымліваем каля 750 тысяч рублёў. Для параўнання, малака мы прадаём штомесяц на 800—900 тысяч рублёў. Але ж на біягазавым комплексе працуе ўсяго 11 чалавек, а на фермах шмат рознага персаналу. Электраэнергію, дарэчы, прадаём на выгадных для сябе ўмовах — з каэфіцыентам 1,3. Такім чынам дзяржава нас падтрымлівае.

— Калі гаспадарка працуе стабільна і не мае ніякіх фінансавых абавязацельстваў, рэнтабельнасць ад работы біягазавай устаноўкі можа складаць 60—70 %, — кажа ён. — Акрамя цяпла і электраэнергіі мы атрымліваем яшчэ і добрае ўгнаенне. Гэта перапрацаваны вельмі якасны гной, на якім цудоўна растуць і кукуруза, і пшаніца, і любая іншая культура.

У працэс атрымання біягазу ўнікаю на месцы. **Начальнік вытворчасці Алег БЯЛЯЎСКІ** дэманструе, як працуе сістэма на экране цэнтральнага камп'ютара.

— Безумоўна, карысць ад такіх установак вялікая, — кажа спецыяліст. — Адбываецца ўтылізацыя гною, атрымліваюцца дарагія энерганосьбіты.

Біягазавы комплекс — гэта восем ферменцёраў і два дабраджваецеля, дзе ўтвараецца газ. Ён выкарыстоўваецца для работы чатырох газапоршневых установак па 1,2 МВт магутнасці кожная. Працуюць рухавікі, круцяцца генератары і выпрацоўваецца электраэнергія, якая трапляе ў сетку «Магілёўэнерга». Адпрацаваны фугат (тое, што застаецца ад біяадходаў) часткова выкарыстоўваецца для тэхналагічнага працэсу, а часткова вывозіцца на палі, як у цвёрдым, так і вадкім выглядзе.

— Для загрузкі ўстаноўкі штодзень неабходна 80 тон кукурузнага сіласу і 320 тон гною ад буйной рагатай жывёлы, — удакладняе Алег Бяляўскі. — У Беларусі мы не адзіныя, хто атрымлівае біягаз, але ж наш комплекс самы магутны. У астатніх устаноўкі да 1—2 МВт. Гаспадаркам, дзе ёсць буйная рагатая жывёла, з дапамогай такіх комплексаў можна цалкам забяспечыць сябе электраэнергіяй. Бо нават танныя энерганосьбіты заўсёды будуць для спажыўца дарагія.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### У ТЭМУ

**Дзмітрый СМІРНОЎ, начальнік аддзела энергетыкі і паліва Камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама:**

— Вельмі цікавы праект быў рэалізаваны ў Кіраўскім раёне на базе ААТ «Світанак». Гэтая ўстаноўка адна з самых буйных у Еўропе. Ёсць цікавыя прыклады будаўніцтва ветрапаркаў. Самыя вялікія пабудаваныя ў Дрыбінскім і Магілёўскім раёнах. Агульная магутнасць ад выкарыстання ўсіх аб'ектаў альтэрнатыўнай энергетыкі ў Магілёўскай вобласці за студзень—жнівень склала 87 МВт — 5,6 МВт за кошт біягазавых установак, 4,1 МВт — за кошт гідраэлектрастанцый, 53,7 МВт і 22 МВт за кошт ветраўстановак і сонечных крыніц. За кошт усіх альтэрнатыўных крыніц энергіі за гэты перыяд выпрацавана 89 мільёнаў кВт электрычнай энергіі. Гэта 3 % спажыванай энергіі ў Магілёўскай вобласці. Для параўнання, адна кватэра ў месяц спажывае 100—150 кВт.

# На шляху да «зялёнай» энергетыкі

## Гродна можа далучыцца да «Пагаднення мэраў»

**Пакуль абласны цэнтр не ўваходзіць у лік гарадоў, якія ўзялі на сябе абавязацельствы знізіць на траціну выкіды парніковых газаў да 2030 года. Менавіта ў такім кірунку аб'ядноўваюцца гарады свету. А між тым гэты рух ужо даволі актыўны і ў Беларусі, тут налічваецца паўсотні гарадоў — прыхільнікаў еўрапейскай ініцыятывы. З Гродзенскай вобласці ў супольнасці 10 гарадоў і раёнаў. Да «зялёнага» пагаднення гатовы далучыцца і абласны цэнтр.**

Трэба сказаць, што акрамя Гродна ў супольнасць пакуль не ўвайшла і Ліда, буйны горад рэгіёна. Менавіта ў гэтых гарадах знаходзіцца большая частка насельніцтва і прамысловых прадпрыемстваў вобласці. Зразумела, што такія гарады аказваюць і большы ўплыў на кліматычныя змены. А, значыць, і выкіды парніковых газаў тут будуць большыя.

Аб тым, як развіваецца ініцыятыва, нядаўна ішла гаворка на сустрэчы па выніках супрацоўніцтва Еўрапейскага саюза і Гродзенскай вобласці. **Старшыня міжнароднай арганізацыі «Экапартнёрства» Юлія ЯБЛОНСКАЯ** зазначыла, што пагадненне мэраў — гэта яшчэ і выгадная справа. Еўрапейскі саюз актыўна падтрымлівае крокі ў бок чыстай энергіі праз фінансаванне розных праектаў.

Некаторыя гарады Гродзенскай вобласці ўжо атрымалі такую магчымасць. Напрыклад, Навагрудку, які з'яўляецца падпісантам Пагаднення, выдзелены гранты на ўстаноўку ветрапарка (4 мільёны еўра) і сонечных панэляў (500 тысяч еўра). Апошнія ўстаноўлены ў раённай бальніцы. Можна сказаць, што кожны горад і раён, які ўваходзіць у супольнасць пагаднення мэраў па клімаце, ажыццяўляў свой «зялёны» праект. У Мастах ды Іўі вядуцца работы па паляпшэнні якасці вады, У Дзятлаве, Карэлічах і Навагрудку пачалася перапрацоўка цвёрдых бытавых адходаў.

— Гэта ўнікальная ініцыятыва, — кажа Юлія Яблонская, — бо яна дапамагае адаптавацца да змены клімату. Гаворка ідзе аб скарачэнні ўжывання паліўна-энергетычных рэсурсаў у ЖКГ, транспарце, муніцыпальнай гаспадарцы, вулічным асвятленні. Да гэтых праектаў павінны далучыцца дэпутаты і актыўна іх прасоўваць.

На гэтую асаблівасць звярнуў увагу падчас сустрэчы кіраўнік Праграм супрацоўніцтва Прастаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Беранд дэ Гроат. На яго думку, «зялёная» эканоміка — актуальны аспект узаемадзеяння. І гаворка ідзе не проста аб пераводзе аб'екта з аднаго віда паліва на іншы, але аб эфектыўным выкарыстанні энергарэсурсаў. У прыватнасці, будаўніцтва ветрагенератараў, выкарыстанне сонечных батарэй, біяпаліва.

Дарэчы, першы ветрак па праграме ЕС у Навагрудку стаў прыкладам для прыватных кампаній. Яны ўстанавілі ў гэтай зоне ветрапарк, які налічвае 13 энергаўстановак. Такім чынам «зялёная» энергетыка тыражуецца ў краіне.

Аргументы сапраўды слушныя. На гэта звярнуў увагу **намеснік старшыні Гродзенскага гарвыканкама Андрэй БОЛТРЫК.** Ён паведаміў, што гэта тэма ў хуткім часе будзе дэтальна абмяркоўвацца гарадскімі ўладамі.

— Трэба займацца «зялёнай» энергетыкай. Ёсць перспектыва падпісаць пагадненне мэраў, але напачатку трэба распрацаваць праграму ўстойлівага развіцця і зацвердзіць на сесіі гарсавета. Думаю, мы гэта зробім, — запэўніў Андрэй Болтрык. — Рэалізацыя праграмы дазволіць выканаць умовы па скарачэнні шкодных выкідаў. Я не магу сказаць, што ў нас пагражальныя абставіны ў гэтым плане. Такога няма. Ёсць рэкамендацыі па паляпшэнні сітуацыі — замена вулічнага асвятлення, уцяпленне тарцовых фасадаў ды іншае. Мы вядзём гэтую работу, але па сваёй схеме. Трэба будзе ўзгадніць нашы пазіцыі, зыходзячы з еўрапейскага вопыту, каб палепшыць экалогію. Гэта цікавая ініцыятыва, і мы абавязкова ў ёй прымем удзел.

Усяго ў Гродзенскай вобласці зараз рэалізуецца 60 трансгранічных праектаў на 30 мільёнаў еўра.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

ПРАЕКТЫ І РАШЭННІ

# SYMBIO CITY — ГОРАД РАЗУМНЫ, ЗЯЛЁНЫ, КАМФОРТНЫ

## Прыярытэт роварам і грамадскаму транспарту, квартальная забудова, гарадскія агароды — у сучасным і будучым Брэста

**Брэст апошнім часам імкліва развіваецца. Многа было зроблена, узведзена, рэканструявана, пасаджана да 1000-гадовага юбілею. Але ж развіццё такога складанага арганізма як горад не ўкладваецца ў формулу — будаўніцтва і пашырэнне. Развіццё па-сучаснаму падразумявае стварэнне зоны камфорту, прыгажосці, зручнасці пры ўмовах энергаэканамічнасці і экалагічнасці.**

### РАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЭКАНОМІКА І ЭКАЛОГІЯ

Абмеркаванне канцэпцыі «Разумнага горада» пачалося ў Брэсце амаль два гады таму. На адным з першых такіх сходаў прысутнічалі архітэктары, вучоныя, экологі, прадстаўнікі ЖКГ і ДАІ, спецыялісты Мінпрыроды, міжнародныя кансультанты. У аснове канцэпцыі «Разумнага горада» на прыкладзе шведскай мадэлі Symbo City закладзена карыснае ўзаемадзеянне паміж усімі органамі гарадской інфраструктуры, якія сумесныя намаганнямі працуюць на павышэнне ўзроўню жыцця горада, яго якасці, камфорту з улікам рацыянальнай эканомікі, захаваннем экалогіі.

І першай прапанованай на гэтым шляху стаў пераход да новай мадэлі прасторавай арганізацыі жылога асяроддзя. Яна мае на ўвазе двары без транспарту, у якіх ёсць школы і дзіцячыя садкі, а будаўніцтва дамоў вядзецца з энергаэфектыўных матэрыялаў. Аказваецца, на этапе праектавання можна ўлічваць і закладваць у жыллё неабходныя характарыстыкі з улікам напрамкаў ветру, ценю і іншых знешніх фактараў. Гэта дазволіць захоўваць неабходную энергію і тым самым, напрыклад, паменшыць затраты на ацяпленне. Такім чынам ужо быў запраектаваны жылы раён у мікрараёне Бярозаўка плошчай у 109 гектараў. Рэалізацыя праекта пачнецца пасля зацвярджэння новага генплана горада.

Яшчэ ў «Разумным горадзе» прадугледжаны прыярытэтныя адносіны да ўсіх відаў грамадскага транспарту ў параўнанні з індывідуальным. Каб пасажыры аддавалі перавагу гарадскім аўтобусам і тралейбусам, трэба выдзяляць для іх асобныя палосы. І гэта работа ўжо распачатая. У першую чаргу грамадскі транспарт атрымае сваю паласу па вуліцы Маскоўскай, бульвары Касманаўтаў, праспекце Машэрава, вуліцах Луцкай і Пінерскай. На многіх прыпынках сёлета ў нас з'явіліся электронныя табло, дзе адсочваецца рух транспарту ў рэжыме рэальнага часу. Таксама дзейнічае сістэма аплаты электроннага білета праз праграму ў смартфоне.

Падчас абмеркавання казалі таксама аб перспектывах рэйкавага транспарту. Трамваяў у Брэсце няма, але сетка чыгуначных пуцей, якія не выкарыстоўваюцца, у горадзе ёсць. На думку архітэктараў, можна стварыць дадатковыя веткі рэек і развіваць рэйкавы транспарт. Гэта тэма ў крыху нечаканым ракурсе нядаўна ўзнікла пры абмеркаванні канцэпцыі выкарыстання старога аўтавакзала. Але пра яе крыху пазней.

### ВЕЛАДАРОЖКІ

Асаблівы раздзел на шляху да «Разумнага горада» — развіццё роварнага руху. У рамках канцэпцыі Symbo City была агучаная ідэя дазволіць на пагранпераходзе «Брэст» перасякаць мяжу на роварах для стварэння транзітнага веламаршруту «Еўравела-2». Але да замежных паездак на двухколавым транспарце пакуль яшчэ шлях не блізкі. А вось для развіцця веласіпеднага руху ў горадзе зроблена шмат.

Роўна год таму на вуліцы 17-га Верасня з'явілася новая веладарожка. І зрабілі яе не на тратуары, як было раней, а на праезнай часты. Перад гэтым на вуліцы памянялі асфальтавае пакрыццё. Спецыялісты кампаніі «СТіМ», якія выконвалі работу па нанясенні раздзяляльнай лініі, выкарысталі таўстаслойную дынамічную разметку.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Яна выдае гул і вібрацыю пры наездзе колам, што карысна як кіроўцам, так і веласіпедыстам, якія не будуць заязджаць далей аднаго метра ад краю праезнай часткі, як патрабуюць ПДР. А кропкавы від нанясення пакрыцця мае ўласцівасць дрэнажу вільгаці і святлоадбівання.

**Дырэктар па бяспецы дарожнага руху і транспартнай мабільнасці ТАА «СТіМ» Сяргей ТАЛАТАЙ** заўважыў, што для сур'ёзнага штуршка ў плане развіцця веласіпеднага руху павінна развівацца інфраструктура: «Трэба, каб ровар стаў зручным транспартам на кожны дзень. Вядома, патрэбныя і асобныя веламаршруты, якія будуць цікавыя турыстам, але ж важнейшая сёння наяўнасць паслуг велашэрынгу, калі ровар можа ўзяць кожны ахвотны і даехаць у любы патрэбны пункт».

### ВЕЛАШЭРЫНГ

І вось доўгачаканы велашэрынг у Брэсце. Кампанія Kolobike прывезла ў наш горад першыя сто ровараў. Цікава, што да гэтага названая кампанія працавала толькі ў Мінску, а з абласных цэнтраў першым выбрала для супрацоўніцтва горад над Бугам. Своеасаблівы заезд-прэзентацыя адбылася 1 кастрычніка. І цяпер жоўтыя ровары можна бачыць каля Лядовага палаца, за Кобрынскім мостам, побач з гандлёвымі цэнтрамі. Асаблівасць у тым, што пакідаць байк можна ў любым месцы. З дапамогай сістэмы GPS гаспадар заўсёды бачыць, дзе знаходзіцца веламашына.

Пакуль узяць у часовае карыстанне ровар можна ў чатырох пунктах горада: каля ўвахода ў гарадскі сад, побач з будынкам адміністрацыі Маскоўскага раёна, каля галоўнага корпуса БрДУ імя А. С. Пушкіна, побач з супермаркетам «Мікс». Кошт арэнды складае 50 капеек за 15 хвілін, за гадзіну трэба заплаціць 2 рублі. Каб скарыстацца паслугай, трэба спампаваць на мабільны тэлефон праграму Kolobike, знайсці і забраніраваць ровар, кожны з якіх мае свой нумар. Далей трэба ўказаць свае прозвішча і імя, прывязаць плацежную картку. Вам дашлюць смс. Застанецца скяніраваць код, замок адкрыецца, і можна ехаць. А дабраўшыся да месца, неабходна закрыць рычажок-замок і паставіць ровар.

Адным з першых апрабаваў новы від транспарту **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.** Ён сказаў, што неўзабаве горад атрымае значна больш ровараў, і яны будуць бела-сінімі пад колер герба і флага Брэста.

### ПЛЯЦОЎКА, АДКРЫТАЯ ДЛЯ ІДЭЙ

Падчас абмеркавання канцэпцыі забудовы і выкарыстання старога аўтавакзала кіраўнік горада расказаў, што спяшацца не варта, лепей дзесяць разоў падысці да гэтай тэмы, каб выпрацаваць адну найлепшую прапанову. І з мэрам нельга не пагадзіцца, бо ўсе хацелі б, каб вызваленая плошча і немалы будынак як найлепш паслужылі гораду і гараджанам. А на конкурс праектаў рэканструкцыі квартала ў межах вуліц Міцкевіча, Карбышава, Пушкінскай і Куйбышава свае прапановы даслалі 11 камандаў архітэктараў, і не толькі з Беларусі. Пры гэтым, адна з канцэпцый, напрыклад, прапануе цікавы спосаб выкарыстання рэйкавых пуцей. Па іх на дзень будуць выязджаць гандлёвыя павільёны на плошчу, а вечарам вяртацца ў ангар-дэпо. А плошча тым часам стане месцам для гулянняў і масавых мерапрыемстваў. Але для гэтага аўтавакзал патрэбна знесці.

Аўтары аднаго з праектаў прапануюць над адным з будынкаў ва ўказаным квартале ўзвесці дадатковы паверх для агарода, паставіць там цяпліцы з памідорамі і агуркамі. Што ж, цяпер гэта модна. Цікавая прапанова паступіла і ад брастаўчан, якія працуюць на дацкае архітэктурнае бюро. Яны бачаць гэты квартал своеасаблівым паркам, у якім знойдзецца месца гандлёвым радам і амфітэатру. Хутка ўсе 11 прадстаўленых канцэпцый будуць апублікаваныя на сайце гарвыканкама, каб кожны мог азнаёміцца і выказаць сваё меркаванне. На горадабудаўнічым савеце маюць намер улічыць заўвагі і прапановы гараджан. Выніі пасяджэння зноў будуць выкладзены ў інтэрнэт, каб атрымаць зваротную сувязь ад жыхароў. Такім чынам, «Разумны горад» прапануецца ствараць усім разам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# РЭЖЫМ АДКРЫТАГА НЕБА. ЧАМУ Б І НЕ?

**КРУГЛЫ стол на тэму «Закон Рэспублікі Беларусь «Аб турызме»: правапрымяняльная практыка, праблемы і кірункі ўдасканалення» адбыўся па ініцыятыве Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.**



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Яе старшыня Віктар Сірэнка зазначыў, што размова на гэту тэму ў камісіі наспела. Калі яшчэ адносна нядаўна ў краіне была адна арганізацыя, якая займалася турызмам, то цяпер гэта поле дзейнасці для вялікай колькасці прадпрымальнікаў. Ды і сам турызм змяніўся радыкальна: развіваюцца агратурызм і падобны да яго экатурызм, медыцынскі, маладзёжны, настальгічны і нават прамысловы турызм, скажам, наведванне БелАЗа. Прычым гэта развіццё адбываецца вельмі хутка, і закон ужо не заўсёды адпавядае патрабаванням часу. Вось і вырашылі ў профільнай камісіі ўважліва выслухаць думкі і прапановы зацікаўленых асоб у паляпшэнні заканадаўчай базы па гэтым відзе дзейнасці.

І сапраўды, апошнім часам Закон «Аб турызме», бадай, больш за іншыя законы знаходзіцца на слыху. Яго актыўна абмяркоўваюць усе, хто так ці інакш звязаны з турыстычнай галіной. Рэдкі сход яе прадстаўнікоў, турыстычныя выстаўкі абыходзяцца без крытычнай аналітыкі палажэнняў закона. Вастрыню абмеркаванню надаў леташні сумна вядомы выпадак банкруцтва расійскага тураператара «Наталі Турс». У выніку страты беларускага боку склалі амаль 700 тысяч еўра. А тут яшчэ падліў алею ў агонь нядаўні крах гіганта сусветнай турындустрыі легендарнай брытанскай кампаніі «Томас Кук».

Таму не дзіўна, што ў пасяджэнні круглага стала прымалі ўдзел прадстаўнікі міністэрстваў спорту і турызму, фінансаў, эканомікі, аховы здароўя, адукацыі, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, Белдзяржстраха, турысцкіх арганізацый і саюзаў. Апошняя ў час размовы ставілі пытанні, як той казаў, рубам. Удар трымаў дэпартамент па турызме Міністэрства спорту і турызму ў асобе намесніка яго дырэктара Віталя Грыцэвіча.

Было відаць, што, як чалавек загартаваны ў гэткіх дыскусіях, ён спрабаваў данесці да прысутных заканадаўцаў па магчымасці поўную і аб'ектыўную карціну з турызмам у краіне і далёка за яе межамі. Асобна спыніўся на глабальных тэндэнцыях яго развіцця ў свеце, агучыў цікавыя лічбы, выклаў свой погляд на памылкі кампаніі «Томас Кук» і турфірмаў іншых краін, якія неабходна ўлічваць і пазбягаць у Беларусі. Віталь Грыцэвіч таксама паведаміў аб мяркуемых захадах міністэрства па карэкцыроўцы Закона «Аб турызме».

Ён асобна падрабязна спыніўся на пытанні патанення авіяцыйных пасажырскіх перавозак. Праблема не новая, але пакуль невырашальная. Сусветны досвед сведчыць аб тым, што краіны, якія плануюць павелічэнне турыстычных плыняў да сябе, выкарыстоўваюць магчымасці лаўкостараў. Нагадаем, гэта бюджэтныя авіякампаніі прапануюць вельмі нізкую плату за пералет у абмен на адмову ад большасці традыцыйных пасажырскіх паслуг.

Віталь Грыцэвіч прывёў прыклад Санкт-Пецярбурга, улады якога ўсур'ёз заняліся лабіраваннем увядзення рэжыму адкрытага неба для міжнароднага аэрапорта Пулкава. Што гэта дасць гораду на Няве, турыстычнай Мецы Расіі? Па папярэдніх падліках, новаўвядзенне дазволіць у паўтара раза павялічыць колькасць замежных турыстаў Санкт-Пецярбурга. А гэта абяцае значны рост валютных фінансавых паступленняў у казну горада.

Дык чаму б у Беларусі з мэтай істотнага росту колькасці замежных турыстаў не ўкараніць рэжым адкрытага неба? І неабавязкова над Нацыянальным аэрапортам пад Мінскам. Можна выкарыстаць магчымасці Гродна ці Брэста, аэрапорты якіх былі мадэрнізаваны. Яны здольны прымаць сучасныя самалёты, лічыць Віталь Грыцэвіч.

Прапанова, безумоўна, цікавая, але вартая грунтоўнага вывучэння і сур'ёзнай прапрацоўкі ў парламенце і ва ўрадзе. Рэжым адкрытага неба прадугледжвае выкарыстанне аэрапорта замежнымі авіякампаніямі. З аднаго боку, гэта паспрыяе іх прыцягненню ў Беларусь, пашырэнню геаграфіі палётаў, павелічэнню ўязнога турызму і гэтак далей. А з другога, трэба падлічыць, якія страты можа панесці наш нацыянальны перавозчык авіякампанія «Белавія»? Што датычыцца Санкт-Пецярбурга, то яму ўжо не першы год не даюць спакою лаўры Венецыі, якая прываблівае больш турыстаў, чым Паўночная сталіца Расіі. Зараз такі рэжым дзейнічае ў аэрапорце Уладзівастока. Але наколькі прыдатны такі падыход для нашай краіны?

У цэлым за круглым сталом адбылася сур'ёзная размова, падчас якой абмеркавалі розныя аспекты планаваных змен у законе. Напрыклад, намеснік міністра фінансаў Андрэй Белкавец выклаў свой погляд на магчымасці і наступствы ўвядзення страхавання пры аказанні турыстычных паслуг. Былі закрануты іншыя практычныя пытанні дзейнасці турфірмаў. У прыватнасці, падрыхтоўка кадраў для галіны з улікам міжнароднага вопыту, дакладнае вызначэнне ролі, правоў і абавязкаў тураператара (у тым ліку і замежнага) і турагента, увядзенне іх фінансавай адказнасці.

Гаворка таксама ішла і аб упарадкаванні экскурсійнага абслугоўвання айчынных і замежных турыстаў. Гэта ў першую чаргу супрацьдзеянне «шэрым» экскурсаводам, якія праводзяць экскурсіі як хочуць і як могуць, адным словам, непрафесійна. Мала, што сярод іх сустракаюцца абсалютна непадрыхтаваныя і недасведчаныя людзі, аповеды якіх уводзяць у зман замежных турыстаў. Але такія экскурсаводы яшчэ і пазбягаюць падаткаабкладання сваіх заробкаў. Што ўжо з'яўляецца парушэннем закона. Таму мяркуецца забараніць займацца экскурсійнай дзейнасцю без праходжання адпаведнай прафесійнай атэстацыі. Плануецца ў новай рэдакцыі закона канкрэтызаваць паняцці «экскурсавод», «гід», «аўдыягід» і «гід-перакладчык».

Выказаныя падчас круглага стала прапановы будуць абавязкова ўлічаны пры канчатковай карэкцыроўцы Закона «Аб турызме». А час прыспешвае. Змен чакаюць прадстаўнікі амаль паўтары тысячы беларускіх турыстычных арганізацый, якія супрацоўнічаюць з партнёрамі больш як са 140 краін. Расце цікавасць і ў нашых суайчыннікаў да арганізаваных турыстычных паездак у межах краіны. Летась такіх было звыш мільёна чалавек. У 2018 годзе Беларусь наведалі 365,5 тысячы замежных турыстаў з 122 краін.

І гэтыя лічбы будуць павялічвацца, запэўніваюць спецыялісты. У Беларусі больш за 15 тысяч помнікаў, якія маюць гістарычную, культурную і архітэктурную каштоўнасць. Прывабліваюць гасцей і нашы аграсядзібы, якіх зараз ужо больш за дзве тысячы. Ёсць што ўбачыць на свае вочы.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**


## ОАО «Белимпортторг» объявляет открытый аукцион по продаже

**Лот № 1:** капитального строения с инвентарным номером 100/С-7139, площадью 3781,6 кв. м (назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административно-бытовой корпус), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001031340, площадью 0,5901 га. Земельный участок принадлежит ОАО «Белимпортторг» на праве постоянного пользования. Составные части и принадлежности капитального строения: асфальтовое покрытие (литер б), ливневая канализация (литер в), внутриплощадочная канализация (литер г), внешние сети водопровода (литер д), наружные теплосети (литер е), наружное освещение (литер ж), низковольтные сети (литер и) по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Инженерная,19В.

Справочно: 1632,9 кв. м площадей капитального строения находятся в аренде.

Начальная цена продажи с НДС (20 %) составляет 1 740 000,00 (один миллион семьсот сорок тысяч) белорусских рублей. Сумма задатка составляет 174 000,00 (сто семьдесят четыре тысячи) белорусских рублей.

**Лот № 2:** изолированного помещения с инвентарным номером 100/D-21411, площадью 1045,4 кв. м (назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду, наименование: помещение блока № 1 и № 2) (гараж), находящегося в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-7150, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 141000000001019655, площадью 0,2627 га по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Инженерная, 19. Земельный участок принадлежит ОАО «Белимпортторг» на праве общего долевого постоянного пользования.

Начальная цена продажи с НДС (20 %) составляет 355 200,00 (триста пятьдесят пять тысяч двести) белорусских рублей. Сумма задатка составляет 35 520,00 (тридцать пять тысяч пятьсот двадцать) белорусских рублей.

Задаток перечисляется на расчетный счет BY76 PJCB 3012 5021 8210 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» ЦБУ 500 г. Брест, (б-р Шевченко, 6/1, г. Брест), БИК PJCBBY2X, УНП 200020512, в срок, установленный для приема заявления и необходимых документов на участие в аукционе.

**Открытый аукцион состоится 31 октября 2019 года в 14.00 по адресу: Республика Беларусь, 224024, г. Брест, ул. Инженерная, 19, 3-й этаж, актовый зал.**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан заключить договор купли-продажи не позднее 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата производится Покупателем в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи. Обязательным условием в договоре купли-продажи является обязанность Покупателя возместить расходы Продавца по проведению рыночной оценки предмета аукциона, а также на публикацию в средствах массовой информации.

Торги проводятся в соответствии с законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже основных средств, принадлежащих ОАО «Белимпортторг», утвержденным организатором торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 (три) календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по адресу: 224024, г. Брест, ул. Инженерная, 19, в рабочие дни по **28 октября 2019 года** включительно с 09.00 до 16.00.

Организатор аукциона – ОАО «Белимпортторг». Контактные телефоны: (8-0162) 45-56-44, 45-52-45, тел./факс 45-53-38, e-mail: entbit@brest.by, www.belimporttorg.by

*УНП 200020512.*

**Совет директоров ОАО «Завод сборного железобетона № 1» доводит до сведения акционеров, что 17.10.2019 г. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Завод сборного железобетона № 1»**

Место проведения собрания – г. Минск, ул. Передовая, 6 (кабинет генерального директора);

Время начала собрания – 11.00.

Время и место регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 10.30 до 10.45 по адресу: г. Минск, ул. Передовая, 6 (кабинет генерального директора).

Время и место ознакомления акционеров с документами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник–пятница), начиная с 11.10.2019 г. по 16.10.2019 г., по месту нахождения ОАО «Завод сборного железобетона № 1»: г. Минск, ул. Передовая, 6 (кабинет генерального директора) с 9.00 до 16.00; 17.10.2019 г. – по месту проведения собрания.

Орган общества, созывающий внеочередное общее собрание акционеров – совет директоров, основание его созыва – собственная инициатива совета директоров.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. О некоторых вопросах реорганизации ОАО «Завод сборного железобетона № 1».

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 15.10.2019 г.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. Для участия в собрании акционеру необходимо при себе иметь паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства.

*Дополнительная информация по телефону + 375 17 398 95 31.*

*УНП 100028892.*

ООО «ДЕСЯТКА-СТРОЙ» сообщает о проведении 29.10.2019 в 14.00 торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества: изолированное помещение (квартира), инвентарный номер 400/D-162948, общей площадью 57,9 кв. м, расположенную по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Тавлая, д. 46Д, кв. 37 – 74 880,00 бел. руб., подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by *УНП 191876910.*

**Центр Промышленной Оценки**

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д.18 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом). Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино**

Производственная база: **цех деревообработки с административными помещениями** (615/С-35497, 1027,1 кв. м), в т. ч. вент. камеры 2 шт., рампа 2 шт., сети питьев. водопровода 184,7 м; сети быт. (255,7 м) и ливн. (287,4 м) канализации, очистные сооружения, двухкамер. септик, поля фильтрации 235 м, покрытия 6446 кв. м; **склад** (615/С-35853, 150,6 кв. м); **КПП** (615/С-35856, 7,6 кв. м), в т. ч. ограждение 639,7 м; **ТП** (615/С-245, 68,3 кв. м); **водозаборная скважина** 615/С-35855), в т. ч. насос Grundfos; **насосная станция** (615/С-35496, 25,2 кв. м), в т. ч. 2 резервуара 150 куб. м, сети пожар. водопровода 484,3 м; **иное имущество:** сети электроснабжения и оборудование (в соответствии с перечнем, размещенным на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Сведения о земельном участке**: пл. **2,5727 га** предоставлен на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно-быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения – находится в охран. зонах электрич. сетей свыше 1000 В, пл. 0,2 га

**Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 07 коп.** (снижена на 50 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** 60 % от цены продажи имущества с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 месяцев

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 24.08.2019**

**Аукцион состоится 12.11.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 11.11.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42, **www.cpo.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375212 24-63-14, +37529 510-07-63.
**Продавец:** открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а. тел. +375212 57-92-13.
**Лот № 1**. Торговый центр, назначение: нежилое здание, этажность: 2 этажа, площадь: 338,9 кв. м, кадастровый номер 35:21:0401011:3989, расположенное по адресу: Российская Федерация, Вологодская область, г. Череповец, Советский пр-т, д. 30, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 35:21:0401011:315 площадью 258 кв. м (аренда). Обременения: договор аренды от 23.09.2019 сроком на 11 месяцев.
**Начальная цена**: 613 944,67 бел. руб. без НДС. Задаток – 61 394,46 бел. руб.
**Дата, время и место проведения аукциона:** 28.11.2019 в 12.00 (по белорусскому времени) по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 11.10.2019 с 08:30 по 27.11.2019 до 17.30. **Задаток перечисляется на** р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.
**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Условия аукциона: победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить затраты по оценке имущества на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 календарных дней со дня проведения аукциона; оплатить объект в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи; в случае недостижения согласия между Продавцом и Покупателем по срокам оплаты имущества имущество оплачивается в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. НДС от цены продажи имущества уплачивается сверх стоимости объекта. Оплата налога на доходы иностранных организаций, не осуществляющих деятельность в Республике Беларусь через постоянное представительство, осуществляется за счет Продавца недвижимого имущества.
**Аукцион проводится** в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: +375212 24-63-14, +37529 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by



РЫНАК ПРАЦЫ

# Дэфіцыт кухараў, санітарак і будаўнікоў

**У Гомелі пра магчымасці працаўладкавання расказалі прадстаўнікі кадравых службаў пяці гарадскіх прадпрыемстваў і арганізацый прамысловасці, грамадскага харчавання і аховы здароўя. У спісе заяўленых вакансій былі рабочыя прафесіі — ад дапаможных рабочых да майстроў участкаў. У медыцыне асабліва патрэбны малодшы медыцынскі персанал.**




Па інфармацыі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама, на сёння ў банку вакансій службы занятасці каля 3200 прапаноў работы. З пачатку 2019 года пры садзейнічанні службы працаўладкавана больш за пяць тысяч чалавек, з іх звыш дзвюх тысяч беспрацоўных.

Арганізатары рэкамендавалі саіскальнікам звяртаць увагу не толькі на варыянты працаўладкавання непасрэдна на кірмашы вакансій, але і вывучаць банк службы занятасці, у якім больш за тры тысячы пазіцый.

На кірмаш вакансій у Гомелі прыйшло паўтары сотні жыхароў горада, якія не маюць пастаяннай работы. Аднак сярод іх не было ніводнага кухара ці кухоннага рабочага, а вакансіі заявілі адразу два прадпрыемствы — камбінат школьнага харчавання і абласны скурна-венералагічны дыспансер. Сёння попыт на кухараў нават без досведу працы значна перавышае колькасць падрыхтаваных спецыялістаў. Магчыма, гэта выклікана і тым, што часта кухары сыходзяць у камерцыйныя ўстановы харчавання, дзе прапануюць 600—700 рублёў заробку, а дзяржаўныя — толькі 450 рублёў. Між тым, раяць спецыялісты, важна цікавіцца і надбаўкамі за дадатковую работу — у выніку можна атрымаць і больш, чым прапануюць у прыватных кавярнях.

Два гомельскія прадпрыемствы чакаюць грамадзян, якія гатовыя працаваць з бетонам. Але ж многія з тых, хто цікавіліся на кірмашы такой магчымасцю, маюць абмежаванні па стане здароўя. Дарэчы, на папярэднюю размову да прыватнікаў дамаўляюцца некалькі грамадзян. Асноўныя патрабаванні — быць фізічна моцным, не піць і не прагульваць. А заробак будзе залежаць ад выпрацоўкі.

Цэлы пералік пасад прапанавала ТАА «Дэлком 40». Вакансіі тут розныя: ад дворніка да эканаміста цэха з навыкамі работы са спецыяльным праграмным забеспячэннем. Рэкруцёры запэўніваюць, што на гэтым прадпрыемстве з еўрапейскім капіталам кар'еру можа зрабіць і прыбіральшчык тэрыторыі — калі будзе старанны, яго заўважаць і прапануюць набыць кваліфікацыю.

Тым, хто хоча набыць кваліфікацыю, упраўленне па працы прапануе прайсці навучанне. Зараз вядзецца набор у групы кіроўцаў тралейбуса, машыністаў кранаў, муляраў. Зусім нядаўна былі ў поўным складзе працаўладкаваны групы прадаўцоў і цырульнікаў. Вядзецца таксама навучанне электрагазазваршчыкаў, слесараў па рамонце аўтамабіляў, аддзелачнікаў памяшканняў, якія пры жаданні могуць адкрыць уласны бізнес.

На мерапрыемстве прадстаўнікі фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, падатковай інспекцыі правялі кансультацыі па фінансавай адукаванасці пры самазанятасці, арганізацыі сваёй справы. Неабходныя плацяжы, фарміраванне справаздачнасцяў — гэтыя і іншыя пытанні растлумачылі кампетэнтныя спецыялісты.

Па інфармацыі ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гомельскага гарвыканкама, на сёння ў банку вакансій службы занятасці каля 3200 прапаноў работы. З пачатку 2019 года пры садзейнічанні службы працаўладкавана больш за пяць тысяч чалавек, з іх звыш дзвюх тысяч беспрацоўных.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# ПІНСК ПАБАГАЦЕЎ ГАНАРОВЫМІ ГРАМАДЗЯНАМІ

**На Дні горада ў Пінску ў мінулую суботу ўшаноўвалі двух новых ганаровых грамадзян. Рашэннем сесіі гарадскога Савета гэты статус атрымалі былыя кіраўнікі горада Васіль ШУСТ і Аляксандр ГОРДЗІЧ. Абодва працяглы час узначальвалі гарвыканкам, Аляксандр Гордзіч таксама тры гады працаваў старшынёй гарадскога Савета дэпутатаў.**

Як адзначыў пры ўручэнні пасведчанняў цяперашні **старшыня гарсавета Лявонцій ЛЕМЯШЭЎСКІ**, за час знаходжання іх пры ўладзе расла эканоміка горада, будавалася жыллё, умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база аб'ектаў сацкультбыту, узводзіліся аб'екты інфраструктуры і добраўпарадкавання, захоўвалася гісторыка-культурная спадчына Пінска. Таму дэпутаты аднадушна падтрымалі ініцыятыву працоўных калектываў аб наданні статусу ганаровага грамадзяніна кожнаму з названых былых мэраў.

Цяпер спіс ганаровых грамадзян горада над Пінай змяшчае 22 прозвішчы. Сярод іх ёсць ветэраны вайны і партызанскага руху, марак-вызваліцель, кіраўнікі прадпрыемстваў, медык, спартсмен, мецэнат. У 2011 годзе званне «Ганаровы грамадзянін Пінска» прысвоена Пятру Фёдаравічу Лысенку за значны ўклад у захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. На жаль, акадэмік Лысенка, які падарыў гораду і свету знакамітае «Бярэсце», такога звання ў Брэсце не мае.

Ёсць у гэтым ганаровым пераліку пінчукоў і жанчына — Зінаіда Мандроўская, якая доўгі час узначальвала адно з прадпрыемстваў Пінска, была дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання. Спіс заўсёды адкрыты для тых, хто сумее дасягнуць велічынь у сваёй справе або праславіць горад за яго межамі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навукі, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 10 кастрычніка 2019 года.**